ІЛЬНАЗАГАТОУКІ

У падарунак 14-ай гадавіне Кастрычніка

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гарному Каму ністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 298 (4204)
Нядзеля, 1 лістапада
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА.

На штурм агратэхнікі!

На основе пасьлядоўнага правядзеньня генэральнай лініі партыі, ва ўпартай, нлўхільнай, барацьбе з правымі і «левымі» апартуністамі, у выніку рашучага наступленьня на капіталістычныя элементы, БССР дасягнула вялізарных посьпехаў на фронце сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Да 14-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі БССР падыходзіць з такімі вынікамі, як аб'яднаньне звыш 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак рэспублікі ў калгасы, разгортваньне соцень спэцыялізаваных—сьвінагадоўчых, ільнаводчых, канаплеводчых, малочна-жывёлагадоўчых—саўгасаў, дзесяткаў МТС і г. д. З рэвалюцыйнай стычнай палі. Аб гэтым гаворыць арганізацыя спэцыялізаваных саўгасаў і калгасаў на Мар'інскім балотным масыве, стварэньне буйных сацыялістычных гаспадарак на вялікіх маліраваных плошчах у радзе раёнаў. Сотні саўгасаў і калгасаў пры дапамозе дзяржавы, шляхам маліраваньня балот, дабіліся значнага павышэньня ўраджайнасьці.

Наш вопыт паказвае, што толькі ва ўмовах САВЕЦКАЙ краіны магчыма ў найкарацейшы тэрмін вырашыць праблему балот, уцягваючы ў сельска-гаспадарчы зварот мільёны гэктараў няпрыгодных зямель. Аднак, ня гледзячы на нашы вялізарныя дасягненьні ў галіне барацьбы з вільгацьцю, з балотам, тэмпы работ у гэтай галіне ні ў якім выпадку нельга прызнаць здавальняючымі. Паход за ўраджай, за якасьць, абвешчаны партыяй, павінен паспяшыць пачаткам штурму балот. Практычныя пытаньні МЭЛІЯРАЦЫІ павінны быць узьняты на належную палітычную вышыню. Адначасова з распрацоўкай і ажыцьцяўленьнем мерапрыемстваў агульна-дзяржаўнага значэньня, ТРЭБА МАБІЛІЗАВАЦЬ НА БАРАЦЬБУ З БАЛОТАМ І ЗАБАЛОЧАНАСЬЦЮ НЕПАСРЭДНА МЕСЦЫ. Раёны, саўгасы, калгасы, вёскі павінны праявіць максымум ініцыятывы ў гэтай галіне, уцягнуўшы ў штурм балот шырокія масы калгаснікаў, саўгаснікаў і аднаасобнікаў. НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫЯ ЎСТАНОВЫ І БАЛОТНЫ інстытут у першую чаргу абавязан быць у першых радох змагароў за высокі ўраджай на балотных і забалочаных землях. ДАСЯГНЕНЬНІ БАЛОТНАГА ІНСТЫТУТУ — НА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ПАЛІ САЎГАСАЎ І КАЛГАСАЎ!

Мэліярацыя—гэта толькі адна з задач.

У цэнтры ўвагі павінна быць пастаўлена задача барацьбы за якасьць, бо па сутнасьці ва многіх мясцох па-бэрбарску скарыстоўваюцца тыя прыгодныя зямельныя плошчы, якія ў нас ёсьць. РАНЬНІ ПАПАР, апрацоўка яго, ЯКАСЬЦЬ ЗЯБЛІВА, СЯЎБЫ, АЧЫСТКА НАСЕНЬНЯ, БАРАЦЬБА З ПУСТАНІКАМ таго, што партыя і савецкі ўрад надаюць пытаньням ураджайнасьці першачарговае значэньне.

Праблема барацьбы за ўраджай мае ва ўмовах БССР свае спэцыфічныя асаблівасьці для роду пытаньняў. Калі дык частка БССР церпіць ад засухі, дык частка БССР церпіць ад лішняй вільгаці. Балота стаіць на шляху да хуткага асваеньня новых вялізарных плошчаў у радзе раёнаў, забалочанасьць зямель не дае магчымасьці атрымаць вялікі (значна большы, чым цяпер) ураджай ва многіх раёнах.

Партыя і савецкая ўлада ўжо дабіліся вялікіх посьпехаў у пераварэньні адзечных балот у квітнеючыя сацыялістычныя палі. Аб гэтым гаворыць арганізацыя спэцыялізаваных саўгасаў і калгасаў на Мар'інскім балотным масыве, стварэньне буйных сацыялістычных гаспадарак на вялікіх маліраваных плошчах у радзе раёнаў. Сотні саўгасаў і калгасаў пры дапамозе дзяржавы, шляхам маліраваньня балот, дабіліся значнага павышэньня ўраджайнасьці.

Наш вопыт паказвае, што толькі ва ўмовах САВЕЦКАЙ краіны магчыма ў найкарацейшы тэрмін вырашыць праблему балот, уцягваючы ў сельска-гаспадарчы зварот мільёны гэктараў няпрыгодных зямель. Аднак, ня гледзячы на нашы вялізарныя дасягненьні ў галіне барацьбы з вільгацьцю, з балотам, тэмпы работ у гэтай галіне ні ў якім выпадку нельга прызнаць здавальняючымі. Паход за ўраджай, за якасьць, абвешчаны партыяй, павінен паспяшыць пачаткам штурму балот. Практычныя пытаньні МЭЛІЯРАЦЫІ павінны быць узьняты на належную палітычную вышыню. Адначасова з распрацоўкай і ажыцьцяўленьнем мерапрыемстваў агульна-дзяржаўнага значэньня, ТРЭБА МАБІЛІЗАВАЦЬ НА БАРАЦЬБУ З БАЛОТАМ І ЗАБАЛОЧАНАСЬЦЮ НЕПАСРЭДНА МЕСЦЫ. Раёны, саўгасы, калгасы, вёскі павінны праявіць максымум ініцыятывы ў гэтай галіне, уцягнуўшы ў штурм балот шырокія масы калгаснікаў, саўгаснікаў і аднаасобнікаў. НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫЯ ЎСТАНОВЫ І БАЛОТНЫ інстытут у першую чаргу абавязан быць у першых радох змагароў за высокі ўраджай на балотных і забалочаных землях. ДАСЯГНЕНЬНІ БАЛОТНАГА ІНСТЫТУТУ — НА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ПАЛІ САЎГАСАЎ І КАЛГАСАЎ!

Мэліярацыя—гэта толькі адна з задач.

У цэнтры ўвагі павінна быць пастаўлена задача барацьбы за якасьць, бо па сутнасьці ва многіх мясцох па-бэрбарску скарыстоўваюцца тыя прыгодныя зямельныя плошчы, якія ў нас ёсьць. РАНЬНІ ПАПАР, апрацоўка яго, ЯКАСЬЦЬ ЗЯБЛІВА, СЯЎБЫ, АЧЫСТКА НАСЕНЬНЯ, БАРАЦЬБА З ПУСТАЗЕЛЬЛЕМ, УВЯДЗЕНЬНЕ ПРАВІЛЬНЫХ СЕВАЗВАРОТАЎ,—усё гэта БАЎЯВІЯ ЗАДАЧЫ, якія стаяць перад кожнай партарганізацыяй, перад кожным саўгасам і калгасам.

Савецкая краіна зьяўляецца адзінай краінай у сьвеце, якая мае ўсе прадпасылкі для рацыянальнага ЗЯМЛЯРОБСТВА. Гэтыя перавагі і павінны быць скарыстаны поўнасьцю шляхам укараненьня АГРАТЭХНІКІ. Але, узброй ваючы нашы саўгасы і калгасы ўсімі сродкамі ПЕРАДАВОЙ агратэхнікі, трэба рашуча пакончыць з пагардлівымі адносінамі да ЗЛЕМЭНТАРНЫХ аграмерапрыемстваў.

Самая рашучая барацьба павінна весьціся з палітычнай недаацэнкай вялізарнага значэньня агратэхнікі, мерапрыемстваў у барацьбе за ўраджай і якасьць. Самы жорсткі адпор КУЛАКУ і яго АГЕНТУРЫ, які імкнецца САРВАЦЬ нашу работу ў гэтай галіне. «Чаго»ыя нашы работнікі думаюць, што агратэхніка—гэта нешта накшталт буржуазнага зебабону» (Я. ЯКАЎЛЕЎ). Яшчэ да гэтага часу ў радзе месц наглядаецца зпачыннае ігнараваньне работ навукова-дасьледчых устаноў, нежаданьне дапамагчы ім. З такімі поглядамі, з такімі адносінамі да агратэхнікі павінна быць неадкладна пакончана. Кожная партарганізацыя, кожны камуніст, кожны рабочы саўгасу і калгасьнік павінен усьвядоміць, што пёзунг «АЎЛАДАЦЬ ТЭХНІКАЙ», высунуты тав. СТАЛІНЫМ, у адносінах сельскай гаспадаркі азначае аўладаньне агратэхнікай на аснове ўжываньня новай, удасконаленай тэхнікі. Гэты пёзунг павінен СТАЦЬ ЗДАБЫТКАМ САМЫХ ШЫРОКІХ МАС. У актыўную барацьбу за агратэхніку, за ўраджай, за якасьць павінны быць уцягнуты ня толькі спэцыялісты, але непасрэдна масы рабочых саўгасаў, калгаснікаў, бедняко ў і серадняко ў-аднаасобнікаў.

ТРЭБА РАШУЧА ПЕРАБУДАВАЦЬ УСЕ НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫЯ ЎСТАНОВЫ, ПАВЯРНУЦЬ ІХ ТВАРАМ ДА САЎГАСУ І КАЛГАСУ.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі савецкая краіна атрымала вялізарную перамогу ў галіне сацыялістычнай перабудовы вёскі, у галіне арганізацыі буйных сацыялістычных гаспадарак. За раз партыя вырашае важнейшую задачу ў новай абстаноўцы—задачу заваяваньня на аснове саўгасаў і калгасаў ВЫСОКІХ УРАДЖАЯЎ.

З РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ НАСТОЙЛІВАСЬЦЮ І СЬМЕЛАСЬЦЮ РУШЫМСЯ НА БАРАЦЬБУ ЗА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ЎРАДЖАЙ! «Выцягнем гэту справу з канцылярый устаноў і габінэтаў вучоных, каб упрэсьчы ў яе і вучоных, і ўстановы, і, што важней за ўсё, сілы самих калгаснікаў і саўгаснікаў» (Я. ЯКАЎЛЕЎ).

Стрыжнёвыя пытаньні савецкага гандлю

Калі паўгода прайшло з дня апублікаваньня адозвы ЦК партыі, СНК і Цэнтрасаюзу аб спажкаапэрацыі.

У гэтай пастанове як асноўныя хваробы каапэрацыі адзначаны былі «неаваротлівасьць і бюракратызм у рабоце, якія вядуць да замарожваньня тавараавароту, з прычыны чаго нярэдка штучна стварэцца беставар'е пры значным павялічэньні тавараных лішкаў. Спажкаапэрацыя,—указваецца ў адозьве, — пачала пагарджаць прынцыпамі звароту і задачай разьвіцьця савецкага гандлю».

Адозва паставіла перад сыстэмай спажкаапэрацыі і органамі Наркамснабу рад важнейшых канкрэтных задач па паляпшэньні савецкага гандлю, паляпшэньні рабочага спажываньня.

Мінула паўгода, усе магчымасьці выкананьня дырэктыў партыі аб савецкім гандлі ў Наркамснаба і Цэнтрасаюза былі ў наяўнасьці. Рост лёгкай індустрыі, бурны рост сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі ўжо ў бягучым годзе стварылі значнае павялічэньне тавараў масы шырокага спажываньня.

Але-ж ці выканалі, аднак, сыстэмы Наркамснабу і спажкаапэрацыі майскія дырэктывы партыі? Гандлёвыя арганізацыі за апошні час разгарнулі работу па правяленьні ў жыцьцё дырэктыў партыі, колькасна гандлёвая сетка значна вырасла. Цэнтрасаюз адкрыў у гэты перыяд 6.758 новых гандлёвых адзінак, Наркамснаб — 4.155. Аднак, гэтыя колькасныя посьпехі нельга прызнаць выстарчальнымі. Сацыялістычная індустрыя расьце бурнымі тэмпамі, стварэцца новыя буйныя прамысловыя раёны і колькасьць магазынаў ня можа зараз задаволіць узросшыя і ўсё ўзрастаючыя патрэбнасьці рабочых мас.

Але калі гандлёвая сетка значна вырасла колькасна, дык якасьць гандлю дагэтуль усё яшчэ застаецца нездавальняючай. Ня гледзячы на значнае павялічэньне тавараў масы ўжо ў бягучым годзе, тавараварот не наладжан, тавары да рабочага спажыўца і калгаснікаў часта спазчасова не даходзяць. Дагэтуль мае месца затаварваньне і рад іншых недахопаў, якія выклікаюцца бюракратычным скажэньнем дырэктыў партыі і практычай механічнага разьмеркаваньня, якая ўсё яшчэ існуе.

Асноўныя фактары, якія перашкаджаюць разгортваньню савецкага гандлю — няўменьне значнай праслойкі работнікаў каапэрацыйна-гандлёвага апарату перайсьці з рэк механічнага разьмеркаваньня тавараў на рэйкі разгорнутага савецкага гандлю і рэшткі непманскага духу ў рабоце гандлёвых арганізацый. Задача заключаецца ў тым, каб дасягнуць зараз на апошнім этапе пэўнага Савецкі саюз увайшоў у перыяд сацыялізму, разгарнуць каапэрацыйны гандаль, якія зьяўляюцца адпаведнай формай разьмеркаваньня, адпаведнай сацыялістычнаму вытворству.

Апартуністы спрабуюць супроцьпаставіць савецкі гандаль пляну, скочваючыся на буржуазныя рэйкі «чыстага гандлю». Гэта скочваньне з партыйных пазыцый на рэйкі буржуазнага «чыстага гандлю» знайшло свае яркае адлюстраваньне ў фактах грубага парушэньня палітыкі цэн, павялічэньня камэрцыйнага гандлю, у пагоні за высокімі прыбыткамі, ў ігнараваньні патрэб рабочага спажыўца і ў прыватнасьці ў адмаўленьні ад пераважнага спажываньня ўдарнікаў.

«Непманскі» дух ня толькі яшчэ ня зжыт, але за апошні час з новай сілай выкрываецца ў розных зьявеньях каапэрацыі. Прычым, новыя праявы «непманскага» духу пуалюцыцца... інтэрэсамі гаспадарчага разрахунку. Зусім ясна, што сапраўдны гаспадарчы разрахунак на ўсіх вучастках нашага сацыялістычнага будаўніцтва, у тым ліку і ў савецкім гандлі, выходзіць з агульна-дзяржаўных, агульна-клясавых пралетарскіх інтарэсаў, а не з хвілінных рвацкіх буржуазных імкненьняў кіраўнікоў таго ці іншага прадпрыемства, тэй ці іншай гаспадарчай ці каапэрацыйнай адзінкі. Укараняючы гаспадарчы разрахунак ва ўсе зьвяны каапэрацыйнай сыстэмы, трэба разам з тым бязьлітасна ўдарыць па тых апартуністах з каапэрацыйнага апарату, якія, замест гаспадарчага разрахунку, працягваюць у сыстэму каапэрацыі «непманскі» дух, капіталістычныя мэтады «чыстага гандлю».

Побач з задачай далейшага павялічэньня колькасьці магазынаў неабходна шырока разгарнуць такія надавычай удалыя і гібкія формы гандлю, як савецкія базары. Вопыт работы такіх баз раў, якія зацягваюцца пакуль па Саюзе дзесяткамі, сябе зусім апраўдаў.

Зараз савецкі гандаль атрымлівае новае палмацаваньне ў твары саўгасаў-ялганьняў, асобных саўгасаў і калгасаў, якія арганізуюць свае гандлёвыя адзінкі ў гарадох і рабочых пасёлках Саюзу для продажу тавараў, якія аддаюцца пасьля поўнага выкананьня імі сваіх абавязкаў у адносінах да дзяржавы.

Вязаўпыннае паляпшэньне дабрабыту рабочай клясы (поўная ліквідацыя бесрабочай клясы (поўная ліквідацыя бесрабоцця, павялічэньне ліку працуючых членаў сям'і, рост зарплаты) прад'яўляе ўсё большыя запатрабаваньні да гандлёвага апарату. Ад усіх гаспадарчых, партыйных і прафесыянальных арганізацый і ў першую чаргу ад органаў рабочага снабжэньня і савецкага гандлю патрэбна настойлівая работа на вышуканьні і мабілізацыі дадатковых тавараных рэсурсаў.

Тут мы маем вельмі вялікія магчымасьці, якія ў асноўным ідуць па дзьвох лініях. Па-першае, арганізацыя пры фабрыках і заводах гародных, сьвінагадоўчых і інш. гаспадарак. Па-другое, мясцовыя загатоўкі. Трэба рашуча выкараніць утрыманчы, «сабезаўскі» пад ход раду арганізацый: нам, моў, зьверху, «з цэнтру», усё дадуць.

Па гэтых двух шляхох — па лініі шырокага масавага разгортваньня спэцыяльных гаспадарак пры фабрыках і заводах і пашырэньня мясцовых загатовак пашэньня пайсьці работа гаспадарчых, каапэрацыйных, партыйных і прафесыянальных арганізацый.

У непасрэднай сувязі з паляпшэньнем савецкага гандлю стаіць пытаньне аб грамадзкім харчаваньні і хлебапячэньні. Патрэбнасьць у грамадзкім харчаваньні, у грамадзкім хлебапячэньні апярэдзіла бурны рост гэтых прадпрыемстваў. Чарговая баявая задача ўсіх партыйных, гаспадарчых і каапэрацыйных арганізацый — фарсаваць будаўніцтва мэханізаваных прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня і хлебазаводаў. У 1933 годзе ў важнейшых прамысловых цэнтрах Саюзу мэханізаваных хлебазаводы павінны цалкам замяніць саматужную выпечку хлеба.

Ва ўсёй рабоце гандлёвай сеткі каапэрацыі і Наркамснабу, саўгасных і калгасных арганізацый, у грамадзкім харчаваньні і хлебапячэньні ў цэнтры ўвагі павінна быць пастаўлена праблема якасьці тавараў. Трэба з усёй бальшавіцкай простасьцю заявіць, што і зараз апартуністычная формула адносін да рабочага спажыўца і калгасьніка «лопай, што папала» ня ўсюды зжыта.

Якавы запас кадры гандлёвай сеткі? Тысячы камуністаў, мабілізаваных пасьля майскай адозвы ЦК, Саўнаркому і Цэнтрасаюзу для работы ў каапэрацыі, бязумоўна асьвяжылі кіруючы цэнтральны, абласны, гарадзкі апарат каапэрацыі. Але гэтыя таварышы яшчэ пашаючай ролі ў рабоце каапэрацыі не адыгрываюць. Прычынай гэтаму служыць слабое аўладаньне імі тэхнікай каапэрацыйнай работы.

Яшчэ горш стаіць справа з пізавым зьвяном савецкага гандлю — кіраўнік гандлёвай адзінкі (магазыну, складу), работнік прылаўка. Сярод работнікаў гандлёвай сеткі — вельмі значны процант былых гандляроў, кулакоў і інш. Адсюль ясна ўся важнасьць задачы падрыхтоўкі новых кадраў гандлёвых работнікаў, выхаваньне старых кадраў і чысткі ад варожых элемантаў.

Трэба, нарэшце, пакончыць з апартуністычнай «тэорыйкай», якая ўсё яшчэ гуляе, нібы ў органах каапэрацыі і дзяржаўнага гандлю можна працаваць, не аўладаўшы тэхнікай савецкага гандлю. Савецкі гандаль, як і кожная галіна нашай народнай гаспадаркі мае патрэбу ў высокакваліфікаваных работніках, якія па-бальшавіцку аўладалі тэхнікай справы. Аўладаць тэхнікай савецкага гандлю — такая зараз чарговая баявая задача ўсіх работнікаў каапэрацыі і дзяржаўнага гандлю і ў прыватнасьці, тысяч камуністаў, якіх партыя паслала туды на кіруючую работу. Для гэтага трэба ў найкарацейшы тэрмін разгарнуць сетку ВТНУ, сярэдніх школ і курсаў, якія падрыхтоўваюць культурных савецкіх работнікаў прылаўку, таваразнаўцаў і кіруючых кадраў дзяржаўнага і каапэрацыйнага гандлю.

«Пытаньні перабудовы спажывецкай каапэрацыі і паляпшэньня рабочага спажываньня павінны стаць стрыжнёвымі пытаньнямі ў рабоце партарганізацый, побач з пытаньнямі індустрыялізацыі». Такава дырэктыва партыі. Толькі пры выкананьні гэтай дырэктывы, толькі тады, калі пытаньні рабочага спажываньня будуць стаяць у цэнтры ўвагі партыйных арганізацый, толькі пры ўмацненьні мясцовых органамі кіраўніцтва сыстэмай савецкага гандлю мы даб'ёмся рашаючых посьпехаў па гэтым важнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва.

«Правда».

Інфармацыйнае паведамленьне

21—31 кастрычніка 1931 году адбыўся пленум ЦК УсеКП(б). Пленум разгледзеў наступныя пытаньні:

1. Справаздачны даклад НКШЗ пра выкананьне пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб чыгуначным транспарце.

2. Справаздачны даклад Наркамснабу і Цэнтрасаюзу аб выкананьні пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК СССР пра разгортваньне Савецкага гандлю і паляпшэньні забесьпячэньня рабочых, з суўкладам ЦКК—РСІ.

3. Практычныя пытаньні бягучай работы.

Рэзалюцыі пленуму па ўсіх гэтых пытаньнях будуць зьмешчаны ў заўтрашнім нумары «Зьвязды».

За выразнае кіраўніцтва загатоўкамі ільну!

АПОШНЯЯ ПЯЦІДНЕЎКА з 21 да 26 кастрычніка НЕ ДАЛА НІЯКАГА ПЕРАЛОМУ Ў ЗАГАТОЎКАХ ПРАДУКЦЫІ ТЭХКУЛЬТУР. Тэмпы загатовак ганебна марудныя. За гэту пяціднеўку загатоўлена толькі 0,4 проц. валакна і 3,2 проц. ільнянога семя. Плян загатовак ільнавалакна за ўвесь час выкананы толькі на 1,4 проц., ільнянога семя на 30,4 проц.

БЕЛКААПСАЮЗ ПА-РАНЕЙШАМУ ПЛЯЦЕЦЦА Ў ХВАСЬЦЕ: загатоўкі ільнянога семя выкананы на 24,2 проц. і валакна—на 0,8 проц.

Калгасы ў раёне дзейнасьці МТС па пляне Белкалгасцэнтру павінны былі здаць на 25 кастрычніка ня менш 15 проц. валакна, а выканалі толькі 1,4 проц. Такім чынам нават адсталі ад іншых калгасаў, якія выканалі плян загатовак валакна на 2,5 проц.

Самым адсталым вучасткам у загатоўках тэхкультур зьяўляецца аднаасобны сэктар, кантрактанты і кулацка-заможныя гаспадаркі. Тут плян загатовак ільнянога семя выканан толькі на 20,2 проценты і валакна на 0,6 проц.

Грубай памылкай Наркамснабу БССР зьяўляецца тое, што даныя вучоту выкананьня загатовак па лініі аднаасобнага сэктару (беднякі і сераднякі), кантрактацыйных дагавораў і кулацка-заможных гаспадарак ставяцца ў адну графу. Гэта «абагульненьне» пазбаўляе магчымасьці выразнага кіраўніцтва загатоўкамі. Кулацка-заможныя гаспадаркі не атрымліваюць адпаведнага націску, бо загатавіцелі ня ведаюць, колькі яны здалі прадукцыі. Трэба зараз-жа нападзіць правільны ўлік, на аснове разгортваньня масавай работы, дабіцца поўнага і своечасовага выкананьня кантрактацыйных дагавораў калгасамі і аднаасобнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі. Трэба прымусіць кулацка-заможныя гаспадаркі неадкладна выканаць цьвёрдыя заданьні па ільнавалакне і сем.

Белкалгасцэнтр, Трактарацэнтр і мясцовыя партыйныя і савецкія, прафсаюзныя, камсамольскія арганізацыі павінны ўзмацніць работу па пераапрацоўцы ільну і выкананьні плянаў загатовак тэхкультур.

Белкаапсаюз, Белільнасаюз і Наркамснаб павінны дабіцца ясных і поўных вестак ад усіх раёнаў. Такое становішча, як на 25 кастрычніка, калі па лініі Белкаапсаюзу з 54 раёнаў прадставілі весткі толькі 18 і па лініі Белільнасаюзу з 21 раёну—19, далей існаваць ня можа. Гэта гаворыць, што Белкаапсаюз, Белільнасаюз і Наркамснаб не зьяўляюцца яшчэ апэрацыйнымі кіраўнікамі, бо ня ведаюць, што робіцца ў большасьці раёнаў.

Карэспандэнцыі з месц гавораць, што загатоўчы апарат яшчэ не ачышчан ад клясава-варожых элемэнтаў, што загатавіцелі яшчэ не пераведзены на аплату ў залежнасьці ад колькасьці і якасьці загатоўленай прадукцыі. Усё гэта таксама зьяўляецца торм зам загатовак.

Выразнае апэрацыйнае кіраўніцтва, зьнішчэньне ўсіх недахопаў у пераапрацоўцы і загатоўцы ільну, рашучы адпор апартуністам, націк на кулака і разгортваньне масавай працы па пераапрацоўцы і загатоўках—забясьпечаць належны посьпех.

Апошнія дні падрыхтоўкі да 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, неабходна выкарыстаць для ўдзесяцярэньня тэмпаў барацьбы за тэхкультуры—за выкананьне плянаў загатоўкі ільну і семя ў найкарацейшы час.

Падхапіць і ажыцьцявіць заклік перадавых калгасаў аб арганізацыі нясупынага патоку ільнавалакна на загатоўчыя пункты—лепшы падарунак 14-й гадавіне Кастрычніка.

Па прыкладзе камуны імя Сталіна ў дзень 7-га лістапада арганізаваць усебеларускі чырвоны абоз з ільном—таварам абавязак кожнага калгасу, МТС, саўгасу і бядняцка-серадняцкай аднаасобнай гаспадаркі.

Цьвёрдыя заданьні дазялі і... супакоіліся

РАГАЧОЎ. (Наш кар.). Большасьць сельсаветаў раёну яшчэ нічога не зрабіла для мабілізацыі рэмаздняцьці на пасьпяховае выкананьне плянаў ільназагатовак. Уся работа абмежавалася толькі тым, што да кулацка-заможных гаспадарак давялі цьвёрдыя заданьні па загатоўках. Сярод калгаснікаў і бядняцка-серадняцкіх мас масавая растлумачальная работа не вядзецца.

У выніку гэтага плян загатовак па ільнавалакне на 20 кастрычніка выкананы толькі на 5,6 проц., па пяньцы на 0,16 проц.

Партыйныя ячэйкі, сельсаветы і загатоўчыя арганізацыі загатоўкамі амаль не займаюцца. Кулацка-заможныя гаспадаркі скарыстоўваюць гэту блазьдзячасьць і нічога ня робяць па выкананьні цьвёрдых заданьняў.

Усё гэта гаворыць аб тым, што і раённая арганізацыя таксама ня прымае мер для ўзмацненьня тэмпаў загатовак. Партарганізацыя павінна прыняць тэрміновыя захады і у бліжэйшы час дасягнуць рашучага пералому ў загатоўках тэхкультур.

САЛАДУХІН.

Пераапрацоўку і загатоўкі тэхкультур правесьці ў карацейшы час

Усім райкомам, райвыканкомам і ўпаўнаважаным ЦК і СНК

Апрацоўка і здача ільна-пяньні працякае зусім нездавальняюча. Ва многіх раёнах наглядаецца яўка апартуністычная недаацэнка значэньня своечасовай апрацоўкі ільна-пяньні і здачы яе дзяржаве. ЦК і СНК абвяшчаюць з 10-га лістапада да 10 сьнежня месячнік апрацоўкі ільна-пяньні і здачы дзяржаве. ЦК і СНК прапануюць:

Неадкладна прыступіць да шырокай падрыхтоўкі месячніка.

Не чакаючы пачатку месячніка, неадкладна прыняць рашучыя захады па ўзмацненьні апрацоўкі ільна-пяньні калгасамі, саўгасамі і аднаасобным сэктарам.

Увязаць апрацоўку са здачай валакна. Забясьпечыць выдачу хлеба кантрактоўшчыкам у поўным разьмеры, прадугледжаным дагаворамі, таксама ўстанавіць кантроль за выдачай прамтавараў і макухі.

Пачаць масавы падвоз трасты і саломы заводам.

Праверыць цьвёрдае заданьне кулацка-заможным гаспадаркам. Прыняць рашучыя захады для спагнаньня яго.

Ні ў якім разе не дапускаць паўтарэньня леташняй памылкі, якая выявілася ў недапушчальнай зацяжцы здачы ільна-пяньні, што сарвала загатоўчыя пляны.

Дабіцца рашучага пералому ў загатоўках ільна-семя, каналель, адгрузкі іх заводам.

Адказнасьць за выкананьне гэтага заданьня ўскладаецца персанальна на саекратароў РК, старшынь РВК, упаўнаважаных ЦК і СНК.

ЦК КП(б)Б ГАНТМАН.
СНК КАЛНІН.

Кулакі разбазарваюць лён

КРУПКІ. Загатоўка прадукцыі тэхкультур прахоўзіць дрэнна. На 20-х ільнавога семя за атоўлена толькі 6 проц. Ільнавалакна не паступіла ні адзнаго кілёграма.

Загатоўчыя арганізацыі стаяць у баку ад загатовак. Масавая работа не вядзецца. Загатоўчы апарат засьмечан былымі гаўлярамі.

Дырэктыва партыйных органаў аб чыстцы загатоўчага апарату ня выканана. Аплата працы загатавіцеляй у залежнасьці ад колькасьці і якасьці загатоўленай прадукцыі не праведзена.

Паасобныя сельсаветы і калгасы да загатоўчых пунктаў прымацаваны направільна. Так, Сакалавіцкі сельсавет, які знаходзіцца на адлегласьці 2—4 кілёмэтрах ад Баброўскага загатавіцеля, ага пункту, прымацаваны да Ўхвальскага пункту на адлегласьці 30 клм.

У выніку такой бязьдзейнасьці кулакі і заможнікі апрацаваны лён пачынаюць разбазарваць, ня выконваючы цьвёрдых заданьняў.

Патрэбны рашучыя меры, каб ліквідаваць прарывы ў загатоўках па Крупскім раёне.

Аймор.

Сіроцінцы рыхтуюцца

СІРОЦІНА.

Нарада старшынь 17-ці калгасаў, сумесна з настаўнікамі і вясковым актывам Каз'янскага сельсавету, аднагалосна прыняла выклік камуны імя Сталіна і ўключылася ў падрыхтоўку да ўсебеларускага чырвонага абозу з ільном да 14-ай гадавіны Каст, нчвіцкай рэвалюцыі.

Гэтыя калгасы маюць 470 гектараў ільну. Ужо намята 55 цэнтнераў ільну. Астатняя траста таксама гатова для мяцьця. Для пасьпяховага выкананьня ўзятых на сябе абавязкаў калгасы стварэюць брыгады для канвэрнай апрацоўкі ільну. Арганізуецца ўзаемадапамога паміж калгасамі.

Гудкоў.

Месячнік праверкі выкананьня загаду тав. Андрэева

БЛІСКУЧЫЯ ПОСЬПЕХІ ВІЦЕБСКАГА ДЭПО

ЗАМАЦОЎВАЮЧЫ ДАСЯГНУТЫЯ ПОСЬПЕХІ, УПАРТА ЗМАГАЦЦА ЗА СВАЯЧАСОВУЮ ПАДАЧУ ЦЯГНІКОЎ ПАД ПАРАВОЗЫ І ВЫКАНАНЬНЕ СЯРЭДНЯ-СУТАЧНАГА ПРАБЕГУ

Процант хворых паравозаў па дэпо Віцебск за апошнія дні—ніжэйшы нормы

Віцебскі вузел ноччу

Рэйд ударнікаў „Праўды", „Зьвязды", „Віцебскага пралетара", „За сацыялістычны транспарт"

У ноч з 27 на 28 кастрычніка ўдарнікамі друку пры актыўным удзеле партыйнага і камсамольскага актыву цягі быў арганізаваны рабкораўскі рэйд па Віцебскім чыгуначным вузьле. У часе начнога рэйду было праверана, як выконваецца асноўны вымернік—сьледзеньне цягнікоў па раскладу, бо ў сярэднім 80 проц. несвячасовага адпраўленьня цягнікоў падае на службу цягі.

Без кіраўніцтва

Дэпо ў начны час знаходзіцца без належнага гаспадарчага кіраўніцтва. У дагаворах на работы даручаньня токарам, сьлёсарам і меднікам расцэнкі адсутнічаюць. Пры прыёмцы работ брыгадзіры або манцёры ня робяць ніякай адзнакі, а гэта дае магчымасьць некаторым рвачам за адну і тую-ж зробленую рэч атрымліваць па некалькі разоў грошы.

У мэханічным цэху адміністрацыйна-тэхнічны нэсэлпал аусім адсутнічае. Цэхі дэпо да зімы не падрыхтаваны: вокны выбіты, дах цячэ, энэргія скарыстоўваецца нерацыянальна, у падвёмцы ў перабочы час гарыць сьвятло і г. д. У цэху выпадковага рамонту выкінута 5 адчышчаных стойлаў. Начная ахова адсутнічае. Дымаю ў электразварцы працуе ўпустую, а дзяжурны электразвярчык Зосенка на гэта ўвагі не зварочвае. Машыны ў гарачым становішчы стаяць з незакрытымі рэгулятарамі. Рэвэрсы пастаўлены на пярэдні і задні ход (паравозы Э—93, 91, Щ—58). Паравозы Щ—438, Щ—2183, Щ—2130 стаяць лад парамі ў 12 атмасфэр без нагляду. Паравоз Щ—432 стаіць на поўным ціску пры адсутнасьці вакамернага шкла і адчыненым рэгулятары ў паравозе Щ—3531, які толькі вынаў з прамыўкі, не аказалася масьлёнкі і помпы Вэсьцінгаўза, якая была зьнята сьлесарамі для другога паравозу.

Сьлесары Амбразевіч і Лук'янаў пры дачы заказу такарнаму цэху на выраб сальнікавых калец пераблыталі нумары паравозаў (замест паравоза 6-67 быў дан заказ на С—87).

Па віне сьлесара Харытонава, які зрабіў дрэнны рамонт поршняваго сальніка, паравоз Щ—529 праз 9 з паловай гадзін работы зноў стаў у рамонт.

Некаторымі рабочымі варштаты пасьля працы пакідаюцца ў брудным становішчы. Так, напрыклад, токар мэханічнага цэху Хапін (член партыі) пасьля сканчэньня работы а 12 гадз. уночы пакінуў варштат брудным і пашоў дамоў.

Працдысцыпліна ў цэхах слабая. У такарны цэх на працягу 3-й зьмены не зьявіўся стругальшчык Шупетін (член партыі) і матарыст Барысёнак, работу якога прышлося замяніць, адарваўшы ад працы качатара.

Сталоўка і буфэт, ня гледзячы на неаднаразовыя запатрабаваньні рабочых—у начны час не працуюць.

Партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі начныя зьмены не абслугоўваюцца.

Чабатар, Ставакоў, Стасыкоў і Грыгор'яў—злосныя зрыўшыкі спаранай

Паравоз на выхаду з дэпо не заўсёды яшчэ мае пастаянага гаспадара. Машыніст Чабатар, які быў выкліканы да паравозу С—62, зьявіўся п'яным, спаранай была сарвана і паравоз да цягніка не пайшоў, замест яго прышлося пасьлаць паравоз С—6. Выкліканы 2 разы памоцнік машыніста паравоза Э—99 Ставакоў таксама не зьявіўся. На паравоз № 745 не зьявіўся памоцнік машыніста Стасыкоў. Манэўроваму паравозу Щ—529 павінен быў быць дан пад зьмену машыніст Грыгор'яў, але ён не зьявіўся, бо быў п'яны.

У кантрольных пастох ураўнілаўка моцна засела

У рабоце кантрольных пастоў ёсьць рад ненармальнасьцяй, якія робяць уплыў на затрыманьне паравозаў. Кантрольныя кнігі вядуцца безадказна. Так, на кантрольным прыёмачным пасту № 2 у кнігах і заўсёды робіцца адзнакі аб часе праходу паравозаў. Ня ўсе машыністы распісваюцца ў кнізе (машыніст ОВ—7576—Зайцаў). Кнігі нікім не правяраюцца ласьля запаўненьня і спальваюцца або рвуцца (!?)

На посту дыску «Ю» кніга таксама завязецца безадказна, у кнізе робяць адзнакі і старшы стрэлачнік і машыніст. Так, машыніст паравоза Щ—404 Іваноў унёс «паправачку»: замест напісаных старшым стрэлачнікам 1 гадзіну 13 хвілін—упісаў 1 гадзіну 15 хвілін. Такіх паправак у кнізе шмат.

Зацікаўленасьці ў добрай рабоце старшых стрэлачнікаў кантрольных пасто

ЧАРГОВЫЯ ЗАДАЧЫ АРГАНІЗАЦЫІ КП(б)Б

У СУВЯЗІ З ПЕРАВЫБАРАМІ ПАРТОРГАНАЎ

Усім гаркомам, райкомам, сельпарткомам і ячэйкам КП(б)Б

15 лістапада пачынаюцца перавыбары партыйных органаў КП(б)Б. Справаздачна-перавыбарчая кампанія зьяўляецца баявым агледам гатоўнасьці бальшавіцкіх радоў да далейшай барацьбы за генэральную лінію партыі, масавай праверкай перабудовы партработы ў адпаведнасьці з новымі задачамі, з новай абстаноўкай.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія гэтага году мае асабліва вялікае значэньне. Яна праходзіць у гістарычным пэрыядзе завяршэньня трэцяга рашаючага году пяцігодкі і падрыхтоўкі да апошняга чацьвертага году пяцігодкі.

Наперакор капітулянцкім прароцтвам правых апартуністаў і іх «левых» саюзь мікаў, КП(б)Б няўхільна ажыцьцяўляючы правільную ленінскую палітыку, дасягнула найвялікшых перамог на ўсіх франтох сацыялістычнай будоўлі.

Наша краіна ўступіла ў перыяд сацыялізму. Пад бальшавіцкім кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) пераможна завяршаецца пабудова фундаменту сацыялістычнай эканомікі. У суадносінах клясавых сіл адбыліся гістарычныя зрухі. Цэнтральная фігура земляробства стала калгаснае сялянства. Сацыялістычны сэктар — саўгасы і калгасы — заваляваў абсалютную перамогу ў эканоміцы сельскай гаспадаркі.

У той-жа час ва ўсім капіталістычным сьвеце эканамічны крызіс набыў нябывалыя катастрафічныя формы, перарастаючы ва многіх краінах у крызіс палітычны.

У СССР ліквідавана беспрацоўе, растуць буйнейшыя гіганты індустрыі.

У капіталістычным сьвеце дзесяткі мільёнаў выкінуты на вуліцу, асуджаны на голад і холад. Закрываюцца буйнейшыя фабрыкі і заводы, скарачаецца прамысловасьць. Імпэрыялісты ўсяго сьвету бачаць выхад з крызісу ў яшчэ большым націску на рабочую клясу, у перакладаньні ўсяго цяжару на плечы рабочай клясы, у яшчэ большым прыгнечаньні калёніі. Разам з тым імпэрыялісты ўсяго сьвету ліхаманкава рыхтуюцца да нападу на СССР.

«Таму кожны раз, калі капіталістычныя супярэчнасьці пачынаюць абвастрацца, буржуазія зварачвае свае погляды ў бок СССР: нельга вырашыць тыя ці іншыя супярэчнасьці капіталізму, або ўсе супярэчнасьці разам узятыя, за лік СССР» (Сталін).

Бальшавікі Савецкай Беларусі — фэр пост СССР — больш, як капі-б там ні было абавязаны ўзмацніць абароназдольнасьць нашай краіны.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна ўзмацніць увагу, сувязь і клопаты ўсіх працоўных аб Чырвонай армії, да работы па вялізнаму працоўнага насельніцтва, да ажыўленьня работы всоавіяхімаўскіх арганізацый.

Ажыцьцявіць шэсьць сталінскіх умоў, поўнасьцю выканаць вытворчую праграму.

па-баявому падрыхтавацца да чацьвертага году пяцігодкі

КП(б)Б, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б), дабілася вялізарнейшых посьпехаў. За тры кварталы бягучага году па 99 прадпрыемствах БССР рост валавой прадукцыі ў параўнаньні з 1930 годам даў 43,7 проц. Па радзе галін прамысловасьці і асобных фабрыкаў і заводах пяцігодка выканана ў тры гады. У строй уступіў рад новых гігантаў. Значна палепшылася матар'яльнае становішча рабочай клясы.

Аднак, разам з тым, многія прадпрыемствы БССР на выканалі сваіх вытворчых праграм як колькасна, так і якасна. У рабоце некаторых галін прамысловасьці (папяровая, абутковая, дрэваапрацоўчая і інш.) ёсьць глыбокія прарывы. Якасьць прадукцыі знаходзіцца на ўсім нездавальняючым узроўні. Асабліва ганебна адстае апалавая (тарфяная) прамысловасьць.

Наша праграма рэальная. Няма і ня можа быць ніякіх аб'ектыўных прычын для апраўданьня прарываў. Посьпехі перадавых заводаў і фабрык, якія датэрмінова выканалі сваю пяцігодку — яркі довад абсалютнай рэальнасьці пляну.

СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА БАЯВОЙ ПАДРЫХТОЎКАЙ ДА ЧАЦЬВЕРТАГА ЗАВЯРШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ І ВЫКАНАНЬНЯ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНАЎ АПОШНЯГА КВАРТАЛУ РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ.

Трэба правільна расставіць сілы на ўсіх працэсах вытворчасьці, канчаткова выкарчаваць абязьлічку і ўстанавіць пэрсанальную адказнасьць за работу кожнага варштату і машыны.

Трэба рашуча фарсаваць перабудову тарыфнай сыстэмы, паклаўшы канец Дробна-буржуазнай ураўніўцы, рашуча праводзячы ў жыцьцё прэміяльна-прагрэсыўную зьдзельшчыну.

ПЕРАВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ ПАВІННА ПРАЙСЬЦІ ПАД ЗНАКАМ КАРЭННАЙ ПЕРАБУДОВЫ ЎСЁЙ ПАРТЫЙНА - МАСАВАЙ РАБОТЫ Ў АДПАВЕДНАСЬЦІ З НОВЫМІ ЗАДАЧАМІ. ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ ЗАМАЦАВАЦЬ ПЕРШЫЯ ПОСЬПЕХІ ПЕРАБУДОВЫ ПАРТРАБОТЫ НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ І ЎЗЬНЯЦЬ ГЭТУ ПЕРАБУДОВУ НА НОВУЮ ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ.

Асноўны цяжар партработы — у нізавое зьвяно, у цэх, групу, брыгаду, на паравоз. Правільная расстаноўка партыйных сіл, далейшая арганізацыя і замацаваньне партгруп, забесьпячэньне кожнага нізавога вытворчага зьвяна партгрупай, партарганізатарам. Узьняць кіруючую ролю трыкутніка нізавога вытворчага зьвяна. Уся партыйна-масавая работа павінна быць дыферэнцыявана ў адпаведнасьці з запатрабаваньнямі розных груп рабочых. На гэтых пытаньнях павінна быць сканцэнтравана ўся асноўная ўвага партарганізацыі.

Камуніст абавязан поўнасьцю апраўдаць сваю авангардную ролю на вытворчасьці. Ні аднаго камуніста, ні аднаго камсамольца па-за актыўным удзелам ва ўдарным руху. Перавыбарчая кампанія павінна быць скарыстана партыйнымі арганізацыямі для новага ўздыму сацыялістычнага спаборніцтва. Асноўнай і рашаючай формай сацспаборніцтва і ўдарніцтва зьяўляецца гаспадарча-разрахунковая ўдарная брыгада.

Барацьба за аўладаньне тэхнікай, за шырокую мэханізацыю вытворчасьці, за новыя крыніцы сацыялістычнага накапленьня і гаспадарчы разрахунак — важнейшыя задачы перавыбарчай кампаніі. У дні перавыбараў прамысловыя партарганізацыі павінны разгарнуць масавую праверку ўкараненьня гаспадарчага разрахунку ва ўсе галіны прамысловасьці. Кожная партарганізацыя абавязана па-бальшавіцку змагацца за выкананьне задач, пастаўленых у адозьве ЦК і СНК аб гаспадарчым разрахунку. Заводы і фабрыкі БССР павінны быць ператвораны ў кузьні камандных кадраў і кваліфікаванай рабочай сілы.

«Цяперашні рабочы, наш савецкі рабочы, хоча жыць з пакрыўцьцём усіх сваіх матар'яльных і культурных запатрабаваньняў...» (Сталін). Культурна-бытавое абслугоўваньне рабочых мас, барацьбу за чыстае культурнае жыльлё, за чыстую рабочую сталоўку — у цэнтр увагі партарганізацыі.

Перавыбарчая кампанія павінна быць шырока выкарыстана для праверкі выкананьня дырэктыў партыі аб перабудове работы каапэрацыі і рэканструкцыі камунальнай гаспадаркі. Задача кожнай партарганізацыі — устанавіць штодзенны кантроль і кіраўніцтва працай каапэрацыі і дзяржаўнага гандлю ў выкананьні задач, пастаўленых перад імі партыяй, праверыць работу кожнага каапэрацыйнага зьвяна, мабілізаваць усе ўнутраныя рэсурсы, шырэй разгарнуць ініцыятыву нізавых каапэрацыйных арганізацый на паляпшэньне работы чага забесьпячэньня і грамадзкага харчаваньня.

Ліквідаваць адставаньне транспарту, выканаць плян асеньня-зімовых перавозак

Чыгуначны і водны транспарт БССР ганебна адстае. Зусім нездавальняючыя тэмпы работы транспарту часта зрываюць выкананьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва.

БАЯВАЯ ЗАДАЧА ЎСІХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ, У ПЕРШУЮ ЧАРГУ ЧЫГУНАЧНЫХ, ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПАСЬПЯХОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК. МАБІЛІЗАВАЦЬ УСЮ МАСУ ЧЫГУНАЧНІКАЎ НА БАЛЬШАВІЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ЗАГАДУ ТАВ. АНДРЭЕВА. РАБОЧЫЯ, АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭХНІЧНЫ ПЭРСАНАЛ ПАВІННЫ БЫЦЬ МАБІЛІЗАВАНЫ НА БАРАЦЬБУ ЗА ЗДАРОВЫ ГАСПАДАРЧА - РАЗРАХУНКОВЫ ПАРАВОЗ, САПРАЎДЫ АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЮЧЫ ЗАМАЦАВАНЬНЕ СПАРАНАЙ, ЗА ЗДАРОВЫ ВАГОННЫ ПАРК, ЗА ЛІКВІДАЦЫЮ АБЯЗЬЛІЧКІ ВАГОННАЙ ГАСПАДАРКІ, ЗА ЯКАСЬЦЬ ПАРАВОЗНАГА РАМОНТУ І МАКСЫМАЛЬНАЕ ВЫКАРЫСТАНЬНЕ ПАРАВОЗУ І ВАГОНУ, ЗА ЛІКВІДАЦЫЮ АБЯЗЬЛІЧКІ, НЕПАВАРОТЛІВАСЬЦІ І КОСНАСЬЦІ Ў РАБОЦЕ ЧЫГУНАЧНАГА І ВОДНАГА ТРАНСПАРТУ.

Мабілізаваць масы на далейшае разгортваньне нацыянальна-культурнага будаўніцтва і ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі

На фронце ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыя непісьменнасьці ўжо атрыманы буйныя перамогі. Партарганізацыі павінны правесьці перавыбары пад знакам далейшага ўзмацненьня барацьбы за ўсеагульнае навучаньне і палітэхнізацыю школ, за ператварэньне БССР у рэспубліку сацыяльна пісьменнасьці, за бальшавіцкую рэалізацыю пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб школе.

Задача ўсіх партарганізацый і ў першую чаргу камуністаў ВНУ і ВТНУ — яшчэ больш узьняць тэмпы падрыхтоўкі новых камандных кадраў для сацыялістычнай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, змагацца за стварэньне тэхнічнай інтэлігенцыі рабочай клясы, аўладаць вышэйшымі навукі.

У галіне палярызацыі работы савецкага апарату, задачай партарганізацый і ў першую чаргу камуністаў савецкіх устаноў, зьяўляецца — штодзенная барацьба і выкарчоўваньне бюракратызму ў апараце, сапраўднае ўкараненьне сацсумяшчэньня, дыферэнцыяванае і жывое кіраўніцтва раёнамі і павышэньне адказнасьці кожнага працаўніка за даручаную яму работу.

БАРАЦЬБА ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ФІНПЛЯНУ, МАБІЛІЗАЦЫЯ ЎНУТРАНЫХ РЭСУРСАЎ, ПРАВЯДЗЕНЬНЕ Ў ЖЫЦЬЦЁ НОВАЙ КРЭДЫТНАЙ РЭФОРМЫ,— ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АДНЭЙ З БАЯВЫХ ЗАДАЧ УСІХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ.

Бурны рост сацыялістычнай будоўлі патрабуе баявой пастаноўкі работы перакладаньні ўсяго цяжару на плечы рабочай клясы, у яшчэ большым прыгнечаньні калёніі. Разам з тым імпэрыялісты ўсяго сьвету ліхаманкава рыхтуюцца да нападу на СССР.

«Таму кожны раз, калі капіталістычныя супярэчнасьці пачынаюць абвастрацца, буржуазія зварачвае свае погляды ў бок СССР: нельга вырашыць тыя ці іншыя супярэчнасьці капіталізму, або ўсе супярэчнасьці разам узятыя, за лік СССР» (Сталін).

Бальшавікі Савецкай Беларусі — фэр пост СССР — больш, як капі-б там ні было абавязаны ўзмацніць абароназдольнасьць нашай краіны.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна ўзмацніць увагу, сувязь і клопаты ўсіх працоўных аб Чырвонай армії, да работы па вялізнаму працоўнага насельніцтва, да ажыўленьня работы всоавіяхімаўскіх арганізацый.

Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, арганізацыя загатовак—цэнтральная задача вясковых партарганізацый

У суровай і непрымірымай барацьбе за генэральную лінію партыі, супроць клясавага ворага і яго агентуры — правых і «левых» апартуністаў — КП(б)Б дасягнула рашаючых посьпехаў на фронце сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. У калгасах ужо звыш 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, ператворана магутная сетка буйных спэцыялізаваных калгасаў. Пад сацыялістычную рэканструкцыю вёскі падводзіцца магутная індустрыяльная база. На палёх БССР працуе 1.740 трактараў, аб'яднаных у 30 машына-трактарных станцый.

Замацаваць посьпехі калгаснага будаўніцтва, па-бальшавіцку арганізаваць калгасную вытворчасьць — ЦЯПЕР АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА.

Кулак, разьбіты ў адкрытым баі, а яшчэ канчаткова не ліквідаваны, намагае ўсе свае сілы, каб падарваць калгас з сярэдзіны.

Адстаяць ураўніпаўку і абязьлічку, сарваць зьдзельшчыну, распаліць спажывецкія настроі ў адсталай часткі калгасьнікаў, штурхнуць калгасы на ядоцкае разьмеркаваньне ўраджаю і даходаў — такава цяперашняя тактыка кулака.

У новых умовах сацыялістычнага будаўніцтва перад партыйнымі арганізацыямі сталі новыя задачы. ГАЛОЎНАЕ ЦЯПЕР — У АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫМ УМАЦАВАНЬНІ КАЛГАСАЎ.

ДАЛЕЙШАЕ РАЗГОРТВАНЬНЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ, ЗАВЯРШЭНЬНЕ СУЦЭЛЬНАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ МАГЧЫМА ТОЛЬКІ НА ПАДСТАВЕ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАГА ЎМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ.

Многія партарганізацыі ня ўлічылі новай абстаноўкі, новых задач калгаснага будаўніцтва. Упартая і настойлівая барацьба за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў у цэлым радзе раёнаў БССР падменена пагоняй за голай лічбай, за дутымі процантамі калектывізацыі.

ТРЭБА СУРОВА І НЕПРЫМІРЫМА ЗМАГАЦЦА СУПРОЦЬ СТАЎКІ НА САМАЦЁК У КАЛГАСНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ І СУПРОЦЬ ПАГОНІ ЗА ДУТЫМІ ПРОЦАНТАМІ Ў КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

ВЯСКОВЫЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ ПРАВЕСЬЦІ ПЕРАВЫБАРЫ ПАД ЗНАКАМ РАШУЧАГА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ СВАЕЙ БАРАЦЬБЫ ЗА БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ЗАГАТОВАК. Зусім нездавальняючае разгортваньне загатовак па БССР ставіць пад удар своечасовае выкананьне гадавога плану. Карэньні такога становішча хаваюцца ў праваапартуністычнай недаацэнцы загатовак з боку цэлага раду раённых партарганізацый і асобных цэнтральных устаноў. Замест сапраўднай барацьбы за выкананьне загатоўчых плянаў, многія партыйныя арганізацыі займаюцца праваапартуністычнымі разважаньнямі аб тым, што «загатоўкі ў БССР не зьяўляюцца важнейшай гаспадарча-палітычнай задачай». Некаторыя раённыя партарганізацыі ня ўлічылі, што загатоўкі ў гэтым годзе праходзяць у зусім новых умовах, у новай абстаноўцы, якая патрабуе кіраўніцтва загатоўкамі па-новаму. У выніку нездавальняючага кіраўніцтва загатоўкамі і праваапартуністычнай недаацэнкі гэтай важнейшай задачы ў цэлым радзе калгасаў БССР, ярка праявіліся яўна кулацкія тэндэнцыі. Многія калгасы замест таго, каб у першую чаргу выканаць свае абавязкі перад пралетарскай дзяржавай і цалкам выканаць загатоўчыя пляны, пад уплывам кулацкіх, рвацкіх настрояў затрымліваюць прадукцыю, якую яны павінны прадаць дзяржаве, стварэньню розных, яўна раздутых, павялічэньня фондаў.

Па рвацкіх настроях, па кулацкіх тэндэнцыях затрымаць у сяло прадукцыю, трэба нанесьці руйнуючы бальшавіцкі ўдар. ВЫКАНАЦЬ І ПЕРАВЫКАНАЦЬ ЗАГАТОЎЧЫЯ ПЛЯНЫ—ПЕРШАЧАРГОВАЯ ЗАДАЧА ЎСІХ КАЛГАСАЎ. БАРАЦЬБА ЗА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ГЭТАЙ ЗАДАЧЫ — АСНОЎНЫ АБАВЯЗАК ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ.

Ход зяблёва па БССР абсалютна нездавальняючы. Плян ворыва стаіць пад ударам. Камуністы саўгасаў, калгасаў і МТС павінны шырэй разгортваць штурм зяблёва. Ні адзін гэктар зябі не павінен застацца неўзораным.

Перабудаваць партработу на вёсцы, узьняць кіруючую і арганізатарскую ролю нізавой ячэйкі

Гэтыя вялікія задачы вясковыя партарганізацыі здолеюць выканаць толькі тады, калі яны карэнным чынам перабудуюць сваю работу. У кожным саўгасе, у кожным калгасе і МТС камуністы павінны рэалізаваць указаньні тав. Сталіна. Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна яшчэ больш узмацніць і ўзьняць ролю вясковай ячэйкі. Ячэйка павінна стаць сапраўдным кіраўніком і арганізатарам усяго жыцьця і вытворчасьці саўгасу, калгасу і МТС. Неабходна падняць удзельную вагу сельпарткомаў, як апорных пунктаў партыі на вёсцы. Райкомы павінны казаць штодзенную канкрэтную дапамогу сельпарткомам у іх рабоце і іх арганізацыйным замацаваньні.

Вялікія задачы ў сувязі з перавыбарамі стаяць перад друкам. ДРУК БССР ПАВІНЕН МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСУ НА БАЯВОЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ СПРАВАЗДАЧНА - ПЕРАВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ. Трэба ўзьняць на яшчэ большую ступень партыкіраўніцтва рабселькораўскім рухам, разгарнуўшы ў дні перавыбараў масавую праверку рэалізацыі пастаноў II усебеларускага зьезду рабселькораў.

ЗАДАЧА ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ — НЕАДКЛАДНА ДАБІЦЦА КАРЭННАГА ПЕРАЛОМУ Ў ХОДЗЕ ВОРЫВА, ЗАМАЦАВАЦЬ НА ЗЯБЛІВЕ ПАСТАЯННЫЯ БРЫГАДЫ, ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ НЕАДКЛАДНУЮ ПЕРАКІДКУ ЎСІХ ТРАКТАРАЎ І ЖЫВОЙ СІЛЫ НА ЗЯБЛІВА.

КОЖНАЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ ПАВІННА ЦЬВЁРДА ЎЛІЧЫЦЬ, ШТО БАРАЦЬБА ЗА ЗЯБЛІВА ЁСЬЦЬ БАРАЦЬБА ЗА АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАЕ ЎМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ І ЎЗЬНЯЦЬЦЕ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ. ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ ЗЯБЛІВА АДНА З АСНОЎНЫХ ЗАДАЧ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ.

Разьмеркаваньне даходнасьці ў калгасах павінна быць праведзена толькі на аснове колькасьці і якасьці працы, затрачанай кожным калгасьнікам, толькі па працаднёх. Партарганізацыі павінны непрымірыма змагацца супроць праваапартуністычнай стаўкі на самацёк у разьмеркаваньні ўраджаю і даходаў, што зьяўляецца простай дапамогай кулаку, супроць «левых» апартуністаў-абаронцаў кулацкага прынцыпу разьмеркаваньня па едаках, абаронцаў дробна-буржуазнай ураўніпаўкі. Сурова і непрымірыма змагаючыся супроць праваапартуністычных і «левых» скажэньняў у разьмеркаваньні даходаў, вясковыя партарганізацыі абавязаны карэнным чынам узмацніць партыйнае кіраўніцтва разьмеркаваньнем даходаў, глыбокае аўладаньне ўсімі дэталямі тэхнікі ў гэтай справе, растлумачыўшы кожнаму калгасьніку, што ён атрымае ў калгасе.

Вясковыя камуністы павінны на справе стаць бальшавіцкімі арганізатарамі калгаснай вытворчасьці. Трэба пакончыць са злачынна марудными тэмпамі пераводу калгасаў на зьдзельшчыну. Барацьба за ўкараненьне сапраўднай зьдзельшчыны (а не папяровай, на фармальнай) ва ўсе калгасы, за дакладны ўлік колькасьці і якасьці працы кожнага калгасьніка, за аўладаньне агратэхнікай, за якасьць, за ўраджай — важнейшая задача вясковых партарганізацый. Трэба шырэй разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Ня можа быць такога камуніста на вёсцы, які-б не зьяўляўся арганізатарам мас калгасьнікаў на барацьбу за разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Рашуча ўдарыць па «ліпуйшчыках», якія на словах за генэральную лінію, а на справе правоўзьняць кулацкую праваапартуністычную практыку.

Перад партарганізацыямі жывёлагадоўчых раёнаў па разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Выкананьне дырэктыў ЦК УсеКП(б) аб разгортваньні жывёлагадоўлі зьяўляецца зусім нездавальняючым. СПРАВАЗДАЧНА - ПЕРАВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ ПАВІННА ДАЦЬ РАШУЧЫ ПЕРАЛОМ У ВЫКАНАНЬНІ ЗАДАЧ, ПАСТАЎЛЕНЫХ ПАРТЫЯЙ У СПРАВЕ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ, ПАМЯТАЮЧЫ, ШТО РАЗГОРТВАНЬНЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ВАЖНЕЙШАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ ЗАДАЧАЙ. Неабходна разгарнуць масавую праверку будаўніцтва сьвінарнікаў і скотных двароў, укамплектаваньня сьвінагадоўчых і малочных таварных фэрм. Неабходна мабілізаваць калгасныя масы на аўладаньне зоатэхнікай. Барацьба за стварэньне высокатаварнай фэрмы, за моцную кармавую базу, за сістэматычнае зьяўляецца адной з цэнтральных папітычных задач.

КП(б)Б дабілася посьпехаў у разьвіцьці тэхнічных культур. Значна вырасла пасеўная плошча пад тэхнічнымі культурамі. СВАЯЧАСОВАЯ АПРАЦОЎКА ІЛЬНУ І ЗДАЧА ДЗЯРЖАВЕ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АСНОЎНАЙ ЗАДАЧАЙ СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ ІЛЬНАВОДЧЫХ РАЁНАЎ. ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ІЛЬНАВОДЧЫХ РАЁНАЎ ПАВІННЫ ЗМАГАЦЦА ЗА ДАЛЕЙШАЕ РАЗЬВІЦЬЦЕ І РОСТ ПАСЕЎНАЙ ПЛОШЧЫ ПАД ІЛЬНОМ.

КП(б)Б мае значныя посьпехі ў саўгасным будаўніцтве. Аднак, цэлы рад раённых і цэнтральных арганізацый ня выканалі задач, пастаўленых партыяй перад саўгасамі. Асабліва гэта выявілася ў пытаньні загатовак, калі ў Белсаўгастрэсьце і пасобных калгасах праявіліся дробна-буржуазныя, праваапартуністычныя настроі і практыка. ЗАДАЧА РАЁННЫХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ І Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ САЎГАСАЎ — ВЫКАНАЦЬ ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ АБ ПЕРАТВАРЭНЬНІ САЎГАСАЎ У САПРАЎДНЫЯ ЎЗОРЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГАСПАДАРКІ.

Перад усімі раённымі райпартарганізацыямі і ў першую чаргу перад камуністамі МТС стаіць задача, каб машына-трактарныя станцыі на справе апраўдалі сваю ролю рухавікоў і арганізатараў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. КОЖНАЯ МТС ПАВІННА НЕАДКЛАДНА ДАБІЦЦА ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНАЎ ЗЯБЛІВА, ЗАГАТОВАК І САПРАЎДНАГА ЎКАРАНЕНЬНЯ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ ВА ЎСІХ КАЛГАСАХ.

Пераўдаваць партработу на вёсцы, узьняць кіруючую і арганізатарскую ролю нізавой ячэйкі

У новых умовах сацыялістычнага будаўніцтва, у новай абстаноўцы трэба кіраваць і працаваць па-новаму. Якасьць і бальшавіцкія тэмпы работы — цэнтральная задача данага пэрыяду.

«У наш век, пры нашых тэмпах, нельга не працаваць над павышэньнем свайго тэарэтычнага ўзроўню» (Постышаў). Справаздачна-перавыбарчая кампанія ПАВІННА ЯШЧЭ БОЛЬШ МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСУ НА БАРАЦЬБУ ЗА ЛЕНІНСКУЮ ВУЧОБУ, ЗА АЎЛАДАНЬНЕ ТЭОРЫЯЙ І ПРАКТЫКАЙ МАРКСЫЗМУ - ЛЕНІНІЗМУ. БЕЗ УЗБРАЕНЬНЯ МАРКСЫЦКА - ЛЕНІНСКАЙ ТЭОРЫЯЙ НЯ МОЖА БЫЦЬ ПАСЬПЯХОВАЙ БАРАЦЬБЫ З ПРАВЫМ І «ЛЕВЫМ» АПАРТУНІЗМАМ У ТЭОРЫІ І ПРАКТЫЦЫ, НЯ МОЖА БЫЦЬ БАРАЦЬБЫ ЗА БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ ВЫКАНАНЬНЯ ГАСПАДАРЧА - ПАЛІТЫЧНЫХ ЗАДАЧ.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна даць узмацненьне работы сярод работніц, калгасьніц і адиаасобніц бядняцак і серадняцак. Неабходна рашуча змагацца з праваапартуністычнымі адносінамі да працы сярод жанчын. Усе павінны памятаць, што без уцягненьня жанчын у актыўную працу ня можа быць пасьпяховага выкананьня плянаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Перавыбары павінны прайсьці на аснове найшырэйшага разгортаньня бальшавіцкай самакрытыкі, на аснове далейшага ўзмацненьня ўнутры-партыйнай дэмакратыі. Перавыбары павінны даць рост партыі за лік лепшых ударнікаў ад варштату, лепшых ударнікаў саўгасаў, МТС і калгасаў.

Сьмялей вылучайце на кіруючую работу праверанных на практыцы таварышоў, лепшых ударнікаў пяцігодкі, адданых барацьбітоў за генэральную лінію партыі.

З новай энэргіяй, сталёвай загартай, непрымірыма змагаючыся супроць правага апартунізму — галоўнай небясьпекі, супроць «левых» загібаў — супроць прымірэнчых да іх адносін — КП(б)Б пойдзе да новых баёў, да новых перамог за генэральную лінію партыі, за сацыялізм.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КП(б)Б.

Вузлавыя задачы ігнараваліся

Асноўным недахопам у рабоце Крычаўскай раённай партарганізацыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі зьяўляецца зусім невыстарчальная ўвага да ажыцьцяўленьня задач арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Падышоўшы да завяршэньня ў асноўным суцэльнай калектывізацыі раёну, кіруючыя органы —РК КП(б)Б і асабліва райкалгасаюз і РВК, многія парт'ячэйкі і сельсаветы супакоіліся на дасягнутых посьпехах у колькасных паказальніках, не паставілі ў цэнтр увагі ўсёй работы задачу правільнай арганізацыі працы ў калгасах, задачу забесьпячэньня гаспадарчай эфэктыўнасьці калектыўнай гаспадаркі.

У радзе ячэек і райкалгассаюзе **гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў ігнаравалася.** У рабоце райкалгассаюзу праводзілася яўная праваапартуністычная практыка, якая не сустракала своечасова рашучага рэагаваньня з боку раённага парткіраўніцтва.

Аб буйнейшых прарывах у справе арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, аб засьмечанасьці многіх калгасаў кулацкімі элемэнтамі, аб праваапартуністычнай практыцы ў рабоце райкалгассаюзу, РВК і многіх парт'ячэек, **«Зьвязда»** сыгналізавала (допісы «Праваапартуністычная практыка не сустракае рашучага адпору» — 9-IX, і «Страцілі клясавую пільнасьць»—18-X) і патрабавала рашучага рэагаваньня. Раённая газэта **«Шлях сацыялізму»** таксама выкрывала шмат фактаў апартуністычнага скажэньня лініі партыі ў калгасным будаўніцтве і зусім **правільна** заварстрала ўвагу партарганізацыі на задачах паляпшэньня работы парт'ячэек у калгасах і неабходнасьці аздараўленьня раённага кіраўніцтва калгаснай сыстэмы.

Аднак, замест таго, каб выкарыстаць сыгналы друку для мабілізацыі парт'ячэек, сельсаветаў і калгасных мас на ўзмацненьне работы па ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы ў калгасах, на аснове ўкараненьня ва ўсе галіны працы зьдзельшчыны, адценнай у працаднёх, на ліквідацыю абязьлічкі ў рабоце, якая мае месца і зараз у пераважнай большасьці калгасаў раёну, на рашучую самачыстку калгасаў ад клясава - варожых, кулацкіх элемэнтаў, **раённае парткіраўніцтва, захопленае аптымізмам колькасных паказальніка ў калектывізацыі, ня толькі не зрабіла адпаведных вываду з сыгналаў цэнтральнага і раённага друку, а аб'ектыўна стала на шлях абароны канкрэтных посьбітаў праваапартуністычнай практыкі.**

СЫГНАЛЫ ПАЧУТЫ

„Хто пісаў і яго сацыяльнае паходжаньне“

Калі зьявіўся ў «Зьвязьдзе» за 9 верасьня допіс «Праваапартуністычная практыка не сустракае рашучага адпору», кіруючыя работнікі РВК і РКС кінуліся шукаць аўтара гэтага допісу і высьвятляць яго сацыяльнае паходжаньне.

Прамаўчаўшы больш чым дэкаду, нарэшце раённае парткіраўніцтва сабралася абмеркаваць допісы, 21 верасьня аб'яднанае пасяджэньне РК КП(б)Б і прэзыдыуму РКК, абмяркоўваючы допісы, зьмешчаныя ў «Зьвязьдзе», «Савецкай Беларусі» і «Шляху сацыялізму» запялося нікчэмным канстатаваньнем дасягненьняў у сваёй рабоце, уключна да распаўсюджаньня пазыкі. (Да рэчы, дасягненьні распаўсюджаньня пазыкі «Трэці рашаючы» ацэнены не фактычна, а паводле пастаноў сходаў). Адносна арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў записалі: **«Калгасы Крычаўскага раёну ў гаспадарча - арганізацыйных адносінах сталі мацней, чым калі-б там ня было».**

Паўстае пытаньне, каму і што дае такое самахвальства. Бясспрэчна, што многія калгасы Крычаўскага раёну значна ўзмацніліся ў параўнаньні з першым пэрыядам іх існаваньня. Інакш і не магло быць. Але зусім шкодна для справы **замазваць** наяўнасьць буйнейшых прарываў у рабоце калгасаў.

Факты—упартая рэч

Зараз няма патрэбы паўтараць тыя абураючыя факты злачыннай безгаспадарчасьці ў радзе калгасаў, значнага аслабленьня працоўнай дысцыпліны і іншых недахопаў, аб якіх мы ўжо ня раз сыгналізавалі. Пакажам толькі, што адзін з важнейшых элемэнтаў, цэмэнтуючых арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў — зьдзельшчына — у большасьці калгасаў раёну праводзіцца фармальна. Устаноўленыя нормы выпрацоўкі ў радзе выпадкаў ня выконваюцца, а з другога боку нормы вельмі паменшаны. Зьдзельшчына па догляднае жывёлы, малацьбе і інш. работах ужываецца толькі ў пасобных калгасах. У раёне на цэрабленьне аднаго гэктара ільну вызначалася 23 чал. і аднаго гэктару канапель — 27 чал., між тым, як гэтыя нормы ў калгасе **«Заветы Леніна»** выконвалі 8 чалавек. Перавесьці-ж практыку арцелі «Заветы Леніна» ва ўсе астатнія калгасы ніхто ў раёне не накланяўся. Зусім дрэнна пастаўлен улік працы і запіс працаднёў у кніжкі калгасьнікаў. У калгасах **«1 мая», Зарубіцкага сельсавету, «Чырвоны партызан»** і **«1 мая»** — Маляціцкага сельсавету і інш. да апошняга часу запіс у кніжкі працадзён праводзіўся толькі ў канцы месяца, прычым даволі часта не паводле ўліку брыгадзіраў, а па словах саміх калгасьнікаў.

Ва ўсіх калгасах раёну вельмі слаба праводзіцца масавая работа

УВЕСЬ ЦЭНТРАЛЬНЫ, РАЕННЫ І НІЗАВЫ ДРУК І РАБСЕЛЬВАЕНКОРАЎ БССР УКЛЮЧЫМ ва ўсесаюзны конкурс, абвешчаны ЦО партыі—„Правдой“—

НА ЛЕПШУЮ РАБОТУ ПА АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫМ ЗАМАЦАВАНЬНІ КАЛГАСАЎ

МЭТАДАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА, СОТНЯМІ НОВЫХ УДАРНЫХ ШТОДЗЕНАК—БУДЗЕМ ЗМАГАЦЦА ЗА ПЯРШЫНСТВА ВА УСЕСАЮЗНЫМ КОНКУРСЕ

Бальшэвіцкае пачынаньне Менгаркому—кожнаму раённаму і гарадзкому камітэтам КП(б)Б

Да ўсіх цэнтральных і раённых газэт БССР

Цэнтральная задача, якая зараз стаіць перад усёй нашай партыяй у галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, заключаецца ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Ажыцьцяўленьне гэтай задачы пачына зьмяняцца з барацьбой за арганізацыю працы ў калгасах настаноўчай ограмы ўліку, правяраньня выдзельшчыны, барацьбой за якасьць работы, арганізацыяй высока-таварных калгасных фермаў, стварэньнем кадраў і г. д.

ЦО нашай партыі «Правда» абвясьціла ўсесаюзны конкурс нізавых газэт саўгасаў, калгасаў і МТС на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Гэты «конкурс нізавых газэт, які абвешчан «Правдой», павінен сабраць у адну магутную крыніцу ўсе намаганьні сельскораў у гэтым імкненні напрамку» («Правда»).

Задача ўсяго цэнтральнага і раённага друку заключаецца імкнна ў арганізацыі гэтага зьбіраньня «ўсіх намаганьняў сельскораў», у накіраваньні іх на барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае умацаваньне калгасаў.

Увесь цэнтральны і раённы друк павінен зараз-жа ўключыцца ў гэты конкурс. Ён павінен стаць на чале ўдзелу у конкурсе нізавых газэт сваёй, вызначанай пастановай ЦК КП(б)Б галіны прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. Ні на хвіліну не выпускаць з поля погляду задач, якія выцякаюць з асноўнай задачы арганізацыйна-гаспадарчага умацаваньня калгасаў.

Мабілізаваць нізавы друк і селькораў на канкрэтны ўдзел у барацьбе за арганізацыю калгасной вытворчасьці, правільнае тавараносьцы яе гаспадаркі, за ўраджай, за аўладаньне агратэхнікай.

Мабілізаваць масы на руйнуючы адпор кулаку і яго апартуністычнай агентуры, згуртаваць калгаснікаў вакол левінскай генеральнай лініі партыі і яе асноўных гаспадарча-палітычных задач—вось задача конкурсу.

Селькоры і нізавы друк павінны стаць перадавікамі ў барацьбе за стопроцантнае выкананьне і перавыкананьне пляну загатовак у вызначаны партыяй і ўрадам тэрмін. Рашуча вырываць і змагацца з новымі манэўрамі кулака, які распальвае спажывецкія настроі ў адсталай частцы калгаснікаў, агітуе за дробна-буржуазную ўраўнілаўку пры разьмеркаваньні даходаў! Нанесьці руйнуючы ўдар па клясовавзрожых, варацкіх, месьніцкіх, па сутнасьці буржуазных тэндэнцыях, больш пакінуць сабе, менш здаць дзяржаве»!

Цэнтральны і раённы друк павінен асаблівую ўвагу зьвярнуць на выразнае ажыцьцяўленьне пастановы ЦК аб спэцыялізацыі раёнаў, на прыцягненьне да ўдзелу ў конкурсе фабрычна-заводзкіх газэт, перадачу іх вопыту арганізаваў работы ў барацьбе за пляны нізавому саўгасна-калгаснаму друку.

Цэнтральны і раённы друк павінен забясьпечыць самыя высокія тэмпы ўдзелу нізавых газэт і рабселькораў у конкурсе, перавёўшы ўсю работу на ройкі сацпаборніцтва, змагаючыся за пярэдніцтва сваёй калёны ў конкурсе з тым, каб па ўсесаюзным конкурсе далі бліца пярэдніцтва для Беларусі ў цалым.

Рэдакцыі «Зьвязда» і «Рабселькор» заклікаюць увесь цэнтральны і раённы друк неадкладна ўключыцца ў конкурс, намеціць канкрэтныя мерапрыемствы, разгарнуць шырокую работу па прыцягненьні да ўдзелу ў конкурсе ўсяго нізавога друку і рабселькораў, па канкрэтным кіраўніцтве і дапамозе ім.

Рэдакцыя «ЗЬВЯЗДЫ».
Рэдакцыя «РАБСЕЛЬКОРА».

ЬССР уключылася ва ўсесаюзны конкурс

МАСКВА
ПРАВДА

Усесаюзны конкурс нізавых газэт саўгасаў, калгасаў, МТС лепшую работу арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў **ўключаемся. Мабілізаваны дванаццаць работнікаў** цэнтральных газэт на месяц для ўмацаваньня работы раённых газэт па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, узмацненьні ўзрацьбы пляны загатовак. **Пяць раённых газэт** на месячны тэрмін пераведзены **штодзённы выхад. Сем раённых газэт** прыступілі выданьня **штодзённых апэрацыйных бюлэтэняй.** Пераключаем **цэнтр увагі конкурсу,** арганізуемы спэцыяльныя палосы газэце **«Рабселькор».** Удзел конкурсе ўключаем **радыё-газэту.** Выдаем **пяцьдзесят тысяч спэцыяльных макетаў штодзённік** для калгасаў, саўгасаў. Зварочваемся спэцыяльным **лістом** ўключэньні конкурс раённых газэтам. Выдаем **дзесяць тысяч** экземпляраў умоў конкурса рассылкі раёнам. **Абавязваемся ход конкурса Беларусі асьвятляць «Правде».**

Культпроп ЦК КП(б)Б.
Рэдакцыя «Зьвязды».
Рэдакцыя «Рабселькор».

ПАСТАНОВА

МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ КП(б)Б аб ШТОДЗЕННЫХ НАСЬЦЕННЫХ ГАЗЭТАХ

1. Адзначаючы, што дасягнутыя Менскай гарадзкой партыйнай арганізацыяй посьпехі ў галіне ўзмацненьня сыстэматычнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькоравскім рухам зьяўляюцца ўсё яшчэ яўна невыстарчальнымі, гарком КП(б)Б з асаблівай вострасьцю канцэнтруе ўвагу ўсёй Менскай гарадзкой партыйнай арганізацыі, кожнай партыйнай ячэйкі паасобку, на необходнасьць згуртаваць усе сілы на далейшым яшчэ больш значным узмацненьні сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькоравскім рухам. Гарком КП(б)Б падкрэсьлівае, што сапраўдную перабудову форм і мэтадаў партыйнай работы, сапраўдную барацьбу за выкананьне 6-ці гістарычных указаньняў тав. Сталіна можна весьці толькі пры ўмове, калі, у прыватнасьці, будзе адпаведным чынам перабудован і рабселькоравскі рух і работа ўсяго нізавога друку.

2. Штодзенныя насьценныя газэты на прадпрыемствах і ў радзе асобных саўгасаў і калгасаў зьявіліся ў выніку бальшавіцкіх тэмпаў барацьбы за сацыялістычнае будаўніцтва, як магутнейшы сродак у руках партыйнай арганізацыі для большай мабілізацыі рабочае клясы і калгасных мас за поўнае і своячасное выкананьне і перавыкананьне зьменна-сустрэчных вытворчых пляноў, за датэрмінсвае выкананьне і перавыкананьне 5-цігадовага пляну па ўсіх яго колькасных і якасных паказальніках. Штодзенныя насьценныя газэты «штодзенкі» выходзілі непасрэдна ў цэху, зьмене, агрэгаце, брыгадзе, групе і г. д., маюць усе магчымасьці забясьпечваць дыфэрэнцыяваную ў адпаведнасьці з характарам і ўмовамі працы пэўнай групы рабочых, апэрацыйную максымальна-канкрэтызаваную барацьбу за выкананьне і перавыкананьне вытворчых пляноў, за практычнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі. Штодзенна зьяўляецца адным з дзейных сродкаў далейшага шчыльнага набліжэньня друку—гэтай «самай вострай, самай моцнай зброі партыі» — да кожнай нават самай дробнай вытворчай адзінкі, штодзенна зьяўляецца яшчэ адным магутнейшым сродкам непасрэднага прыцягненьня новых тысяч ударнікаў да самага актыўнага ўдзелу ў пралетарскім друку, адным са сродкаў ажыцьцяўленьня спэцыялізаванага кіраўніцтва рабселькоравскім рухам, забясьпечваючым далейшы вялізарны ўздым рабселькоравскага руху і нізавога друку.

3. Канстатуючы значныя колькасныя дасягненьні, якія ёсьць па радзе менскіх прадпрыемстваў у справе разгортваньня сеткі штодзенных насьценных газэт (завод імя Варашылава—21, Бальшавік—9, «Дрэваапрацоўшчык»—9, абутковая фабрыка—3, служба цягі—8, завод «Камунар»—7, шчотачная фабрыка—5 і г. д.) гарком КП(б)Б лічыць необходным побач з далейшай самай энэргічнай актывізацыяй ініцыятывы прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў і г. д. у справе стварэньня штодзенак сканцэнтраваць таксама выключную ўвагу на необходнасьць грунтоўнага змацаваньня ўсіх ужо створаных штодзенак, рашучага паляпшэньня якасьці зьместу, забясьпячэньня іх сапраўды штодзеннага выхаду без усялякіх перабояў і затрыманьняў.

4. У мэтах замацаваньня існуючых штодзенак і стварэньня шырокай сеткі іх на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах, стварэньня ў першую чаргу гэтых штодзенак на тых вытворчых вучастках, якія зьяўляюцца рашаючымі ў справе барацьбы за выкананьне пляну, Менскі гарком КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЕ:

а) Абавязаць партарганізацыі тых прадпрыемстваў, дзе да гэтага часу адсутнічае работа па стварэньні штодзенак (завод «Полымя рэвалюцыі», Менбуд, фабрыка «Усход», хлебазавод, друкарня імя Сталіна і г. д.) у трохдзённы тэрмін склікаць нечарговыя пасяджэньні бюро цэхавых партыйных і камсамольскіх ячэек сумесна з партыйнай часткай фабкому і гаспадарчага кіраўніцтва, на якіх канкрэтна абгаварыць пытаньне аб стварэньні сеткі штодзенак.

б) Лічыць, што замацаваньне існуючых штодзенак і далейшае разгортваньне сеткі іх зьяўляецца адной з адказнейшых задач усёй партарганізацыі. Сыстэма пабудовы сеткі штодзенак павінна адпавядаць сыстэме пабудовы парторганаў на кожным прадпрыемстве паасобку, ставячы, як задачу, стварэньне штодзенак там, дзе ёсьць партыйныя ячэйкі і партгрупы. Стварэньне штодзенак там, дзе няма парт'ячэек і партгруп, дапускаць пры ўмове абавязковага забясьпячэньня гэтых штодзенак партыйным кіраўніцтвам.

в) Даручыць культпропу гаркому разам з фракцыяй гарпрафсавету пры ўдзеле цэнтральных газэт і газэтнага аддзяленьня Камвузу імя Леніна ў 2-х-дзекадны тэрмін арганізаваць спэцыялізаваныя месячныя курсы для рэдактароў і рэдкалегій штодзенак, арганізуючы курсы па прынцыпе дыфэрэнцыяванага ахопу імі рэдкалегій штодзенак вядучых галін прамысловасьці.

г) Работу членаў рэдкалегій і рэдактароў штодзенак, лічыць асноўнай партыйнай і прафэсыянальнай нагрузкай і ад усялякай іншай грамадзкай нагрузкі іх у дзекадны тэрмін безадкладна (пад адказнасьць сакратароў ячэек) вызваліць.

д) Абавязаць фракцыю гарпрафсавету даць паказаньне фабзаўмясцкомам аб выпісцы рэдактарам штодзенак за кошт культфондаў часопісі «Правдист», «Рабоче-крестьянский корреспондент» і газэту «Рабселькор».

е) На працягу лістапада студзеня заслухаць на сакратарыяце гаркому даклады 12 найбольш буйных парткалектываў аб становішчы штодзенак з папярэднім абсьледваньнем гэтых прадпрыемстваў інструктарамі гаркому.

ж) Праз месяц заслухаць на бюро гаркому КП(б)Б даклад аб якасьці выпускаемых штодзенак і канкрэтнай дапамозе штодзенкам з боку парт'ячэек. Для прадпісаньня масавага вывучэньня зьместу выпушчаных нумароў штодзенак, абавязаць партком Камвузу ў парадку партыйнай нагрузкі выпучыць 15 студэнтаў апошняга курсу і 20 студэнтаў газэтнага аддзяленьня.

з) Пасьля падагульненьня вынікаў працаўоўкі зьместу выпушчаных нумароў штодзенак склікаць агульна-гарадзкую канфэрэнцыю рэдактароў штодзенак з абавязковым удзелам партгарганізатараў, груп, сакратароў цэхавых парт'ячэек і партколектываў, старшынь фабкомаў і дырэктароў прадпрыемстваў і загадчыкаў цэхамі. На нарадзе абгаварыць вынікі гэтага абсьледваньня, а таксама, у прыватнасьці, завастрыць увагу на пытаньні аб ролі штодзенак, як колектыўнага рабкора шматтыражкі і цэнтральнага друку.

і) Абавязаць інструктароў гаркому КП(б)Б пры правядзеньні абсьледваньня ячэек абавязкова грунтоўна вывучаць і давяць ацэнку становішча работы сярод рабкораў і нізавога друку і, ў прыватнасьці, штодзенак.

і) Пры стварэньні штодзенак абавязкова ўлічваць необходнасьць абслугоўваньня імі працоўных нацменшасьцяй на іх роднай мове.

л) Адзначаючы ўзрослую ролю шматтыражак у іх дапамозе партыйным калектывам і ячэйкам у кіраўніцтве нізавым друкам прадпрыемства, абавязаць рэдкалегіі шматтыражак узмацніць штодзенную дапамогу штодзенкам праз сыстэматычныя агляды зьместу штодзенак, перадачу вопыту іх на старонках шматтыражак, скліканьне спэцыялізаваных нарад рэдкалегій штодзенак, дапамогу ў выпрацоўцы плянаў работы ў барацьбе за дзейсьцасьць зьмешчаных у штодзенках матар'ялаў і г. д. Выключная і асабліва завостраная ўвага ўсіх штодзенак павінна быць сканцэнтравана на барацьбе за самую высокую бальшавіцкую якасьць свайго зьместу, за выкананьне 6-ці гістарычных умоў тав. Сталіна, за перавод работы ўсіх штодзенак на сыстэматычную планавую работу.

м) Гарком з асаблівай сілай падкрэсьлівае задачу далейшага разгортваньня перабудовы рабселькоравскага руху на падставе пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16 красавіка, задачу ўкараненьня ударніцтва ў друку і ператварэньня ўдарных брыгад друку ў вядучае зьвяно рабселькоравскага руху. Гарком разам з гэтым абавязвае забясьпечыць самую глыбокую і сур'ёзную сыстэматычную работу з рабселькорамі-адзіночкамі і іх уцягненьне ва ўдарныя брыгады друку.

н) Гарком рашуча асуджае, як праяўленьні «левацкіх» загібаў у пытаньнях нізавога друку, асобныя разважаньні аб неасходнасьці зьнішчэньня цэхавых газэт і падкрэсьлівае, што цэхавая газэта ў сувязі са стварэньнем штодзенак набывае яшчэ большае значэньне, як арганізатар і кіраўнік штодзенных насьценных газэт у брыгадах, зьменах і г. д.

о) Адзначаючы нездавальняючую работу гаркому ЛКСМБ і гарпрафсавету па арганізацыі прапрацоўкі і рэалізацыі пастаноў 2-га ўсебеларускага зьезду ў галіне ўзмацненьня нізавога друку і перабудовы рабселькоравскага руху, гарком прапануе: гаркому ЛКСМБ зарэжка намеціць канкрэтныя мерапрыемствы і вызначыць каляндарны тэрмін іх ажыцьцяўленьня па разгортваньні работы з юнкорамі і падборы камсамольцаў у дапамогу рэдкалегіям насьценных газэт; гарпрафсавету намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па ўдзеле прафарганізацый у разгортваньні штодзенак.

На бліжэйшым пасяджэньні сакратарыяту гаркому КП(б)Б заслухаць даклад гаркому ЛКСМБ аб рабоце з юнкорамі.

5. На ўсіх чарговых адкрытых партсходах ячэек першым пытаньнем прапрацаваць гэтую пастанову гаркому КП(б)Б з вызначэньнем канкрэтных мерапрыемстваў і тэрмінаў іх каляндарнага выкананьня.

6. Пастанову апублікаваць у друку.

Рабкоры і нізавы друк рыхтуюцца да Кастрычніцкіх сьвят

ПАНЧОШНАЯ ФАБРЫКА ІМЯ КЛАРЫ ЦЭТКІН (ВІЦЕБСК)

На фабрыцы праведзен агульна-фабрычны зьлёт рабкораў па пытаньні падрыхтоўкі і ўдзелу ў правяджэньні сьвят каваньня XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Рабкоры фабрыкі абавязаліся прыняць рашучыя меры да канчатковай ліквідацыі да XIV гадавіны Кастрычніка ганеб нога прарыву ў выкананьні прамфінпляну. Для гэтага нізавы друк і рабкоры абавязаліся павесьці рашучую барацьбу з прагуламі і спазьненьнямі, якія яшчэ маюць месца на фабрыцы, і прыняць актыўны ўдзел у арганізацыі гаспадарча-разрахункових брыгад з тым, каб да сьвята арганізаваць на фабрыцы пераход 10 брыгад на гаспадарчы разрахунак.

Нізавы друк і рабкоры абавязваюцца падрыхтаваць лепшых рабкораў-ударнікаў да ўступленьня ў партыю і ЛКСМ, уцягнуўшы іх у палітшколы і гурткі. Сумесна з фабкомам склікаецца канфэрэнцыя работніц, дзе будзе зроблен даклад тав. Бэрэзінай (якая прымала ўдзел у замежнай паездцы ўдарнікаў) з мэтай азнаямленьня рабочых і работніц са становішчам рабочых у краінах капіталу і рэвалюцыйным рухам за мяжой.

Адначасова наладжаецца ў прыгарадную гаспадарку імя МОПР'у і калгас «Бальшавік» брыгада рабочых і рабкораў, якая дапаможа ва ўборцы ўраджаю, падрыхтоўцы да сьвята і арганізацыі выпуску насьценгазэт. Да XIV гадавіны на ўсіх цэхах арганізуецца выпуск штодзенак «За работу па-новаму».

ДРУКАРНЯ ІМЯ СТАЛІНА (МЕНСК)

24 кастрычніка адбылася нарада сакратароў партыйных ячэек і рэдкалегій насьценгазэт.

Нарада пастанавіла да XIV гадавіны Кастрычніка арганізаваць у цэхах выданьне 6-ці штодзенных газэт, забясьпечыўшы іх штодзённым партыйным кіраўніцтвам.

Арганізуюцца 3-хдзённыя курсы для членаў рэдкалегій і штодзенак. Сярод рабочых шляхам правядзеньня гутарак папулярызуюцца задачы і мэты штодзенных насьценгазэт.

Выкончаючы пастанову нарады, 26-га кастрычніка была выдана першая штодзенка ў лінатыпна-газэтным аддзяленьні наборнага цэху друкарні.

С. П.

МАШЫНА-БУДАЎНІЧЫ ЗАВОД «ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТ» (ВІЦЕБСК)

Рабкоры завода «Чырвоны мэталіст» пастанавілі 100 процантным выкананьнем праграмы дабіцца зьняцьця заводу з чорнай дошкі. Для гэтага намечаны рад практычных мерапрыемстваў.

Рабкоры сумесна з працаўнікамі планавага і тэхнічнага аддзелу і тэхнічным дырэктарам распрацавалі пляны, якім прадугледжана арганізацыя лекцый і гутарак па цэхах аб канкрэтных мерах барацьбы з бракам, па пытаньні пераводу брыгад на гаспадарчы разьлік і г. д.

Па цэхах арганізуюцца брыгады імя XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі з рабкораў і рабочых-ударнікаў.

Бэрсон, Папішы Чалей.

Наладзіць штодзенны выпуск старонкі моладзі

Юнкоры друкарні імя Сталіна прымаюць актыўны ўдзел у рабоце нізавога друку сваёй друкарні. Амаль што з першага свайго нумару шматтыражка «Друкарская праўда», а ў мінулым «Чырвонае шыла» (былая шматтыражка) зьмяшчае куткі моладзі, дзе камсамольскі калектыў узьнімае цэлы рад канкрэтных пытаньняў па разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва, узмацненьня работы ўдарных брыгад, унутрэкасавой работы, бытавых умоў моладзі, інтэрнацыянальнага і антырэлігійнага выхаваньня і г. д.

Але ўсё гэта несыстэматычна, ад выпадку да выпадку. Не наладжан яшчэ пастаянны выхад моладзьнай юнкораўскай старонкі. Існуе неадаровая тэндэнцыя, как замест камсамольскай старонкі выдаваць асобныя лісты (са слоў рэдактара).

Такі буйны недахоп, як нерэгулярнае выданьне моладзьнай старонкі тлумачыцца тым, што закол яе не арганізован юнкораўскі актыў. Член рэдкалегіі шматтыражкі, адказны за юнкораўскую старонку, не праводзіць з юнкорамі пякай работы. Старонка моладзі рыхтуецца (па заяве самога рэдактара шматтыражкі) толькі тады, калі «націсьне» сакратар калектыву.

Гэты буйнейшы недахоп у рабоце шматтыражкі сталінцаў павінен быць зьнішчаны. Яна сумесна з камсамольскім калектывам павінна разгарнуць шырокую масавую работу сярод моладзі з мэтай прыцягненьня яе да актыўнага ўдзелу ў працы як старонкі моладзі, таксама і ўсяго нізавога друку друкарні і ўсёй грамадзкай работы.

Шматтыражка і камсамольскі калектыў друкарні імя Сталіна павінны прыняць самыя рашучыя меры для наладжаньня сыстэматычнага выданьня старонкі моладзі.

Н. Д.



Ураладзьбоўц. Заканчэньне будаўнічай брыгады

Множце вопыт варашылаўцаў

Машына-будаўнічы завод імя ВАРАШЫЛАВА, дзякуючы ўмацненьню партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабкорскім рухам—да 2-га ўсебеларускага зьезду рабселькораў пры ліку з калізарнейшымі дасягненьнямі. Замест 4-х насьценгазэт, якія выходзілі раней, да кажрыцьця зьезду мы арганізавалі выданьне 12-ці газэт, якія выходзяць больш рэгулярна, але ўсё-ж ня больш, як раз у дзекаду. Армія рабкораў-ударнікаў з 120 вырасла да 300 чалавек.

Перабудова работы па-новаму, згодна указаньняў правадыра нашай партыі тав. Сталіна, пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове рабселькоравскага руху, і рашэньні 2-га ўсебеларускага зьезду рабселькораў, паставілі на ўвесь рост задачу перабудовы работы нізавога друку заводу па-новаму, набліжэньня яго да вымены і брыгады.

Яшчэ да зьезду, у маі месяцы пры непасрэдным кіраўніцтве і ўдзеле газ. «Рабселькор» у мэтах дапамогі трыкутнику заводу ў ліквідацыі ганебнейшага вытворчага вінаватых у прагулах газэты, зьмяшчалі іх на чорную дошку, выводзілі са складу рэдкалегіі і г. д. Быў выпадак роспуску рэдкалегіі штодзенкі брыгады камнядрабілак «Акмэ» за прагулы і арыў работы. Новая рэдкалегія на чале са старым рабочым-ударнікам—па ўдарнаму ўзялася за работу. У першыя дні выданьня штодзенак былі выпадкі, калі матар'ял газэты пісаўся выключна зьменнай рэдкалегіяй. Рэдакцыя «Чырвоны молат» правяла нараду рэдактароў штодзенак, на якой дала ўстаноўку па пытаньні арганізацыі матар'ялу.

Рад штодзенак (першай групы такарноў, брыгады грэйсартовак нацельнага цэху, матар'яльна-гаспадарчага аддзелу) ратарнулі масава-апэрацыйную работу, удзельнічаючы ў яе рабкораў-ударнікаў, практыкуючы брыгадны мэтад работы.

З пераводам раду штодзенак на апэрацыйны плян, арганізаваны матар'ял пачынае ў штодзенцы пераважаць над матар'ялам самацёчным.

Пляны, увязаны з агульнымі задачамі прадпрыемства на даны адрэзак часу, пераглядаецца на месяц і гэты плян уладкоўваецца дакладным каляндарным планам, які вызначае канкрэтныя мерапрыемствы па арганізацыі матар'ялу, адказных за яго арганізацыю, дні паступленьня і г. д. На сёньняшні дзень на пляновую работу пераведзена 6 брыгадных штодзенак, да 14-ай гадавіны Кастрычніка на плян будуць пераведзены яшчэ 10 штодзенак.

Гэтымі днямі пачынае выходзіць штодзенка ў брыгадзе малярноў на ўдарэйскай мове.

Паміж штодзенкамі разгорнута сацспаборніцтва па лепшай арганізацыі работы. Так, штодзенка грэйсартовак выклікала на сацспаборніцтва штодзенкі сьвідравальных варштатаў і разгорнута сацпаборніцтва паміж штодзенкамі груп такарнага, нацельнага і ліцейнага цэхаў.

Калі ў брыгадзе грэйсартовак намецілася пагроза зрыву ў выкананьні пляну, штодзенка забіла трывогу, знайшла прычыны прарыву, змагалася за ліквідацыю непаладак унутры брыгады і ў выніку дабілася арганізацыі мас на выкананьне і перавыкананьне пляну.

Штодзенка дапамагала пераводу брыгады на сацыялістычны брыгадны гаспадарчы разрахунак, прэміяльна-прагрэсыўную зьдзельшчыну, адпрацоўкі ўдзел у абмеркаваньні гэтых пытаньняў, удзельнічала ў складаньні дагавораў, правярала выкананьне.

Штодзенка брыгады сьвідравальных варштатаў змагаецца за выкананьне адміністрацыяй пункту дагавору, згодна якога дэталі для зборкі павінны быць дастаўлены брыгадзе за два дні да яе пачатку. Для гэтага арганізоўваецца пост з 4 рабкораў-ударнікаў у першай друце токараў, якая апрацоўвае дэталі сьвідравальных варштатаў. Вынікам арганізацыі масавай работы гэтых настоў штодзенак зьявілася атрыманьне дэталяй для зборкі.

Брыгада торфпрасаў з-за адсутнасьці апрацованых дэталяй можа ня здаць у тэрмін 10 торфмашын. Намячаецца глыбокі прарыў. Маладая яшчэ ў той час штодзенка брыгады торфапрасаў узьнімае грамадзкую думку цэху і ўсяго заводу вакол необходнасьці своячасовага выпуску 10 машын.

Па яе ініцыятыве склікаецца вытворчая нарада брыгады разам з токарамі, від якіх залежала дастаўка дэталяй для зборкі. Нарада, абмеркаваўшы пытаньне грамадзкую думку цэху і ўсяго заводу вакол необходнасьці своячасовага выпуску 10 машын.

Па яе ініцыятыве склікаецца вытворчая нарада брыгады разам з токарамі, якія залежала дастаўка дэталяй для зборкі. Нарада, абмеркаваўшы пытаньне своячасовай дачы 10 торфапрасаў, дабілася ад адміністрацыі цэху выданьня загаду аб апрацоўцы без чэргі дэталяй для зборкі торфапрасаў. У выніку мабілізацыі штодзенкай усіх рабочых цэху, 10 торфапрасаў былі выпушчаны своячасова.

Такія-ж прыклады бальшавіцкай работы паказваюць штодзенкі нацельнага, ліцейнага і іншых цэхаў.

Так, штодзенкі нацельнага і такарнага цэхаў дапамаглі трыкутнику дабіцца ліквідацыі абзьялічкі варштатаў і інструментаў.

Штодзенка ліцейнага цэху праводзіць вялікую работу па паляпшэньні санітарнага становішча.

Дуп і разьдзяльня адрамантаваны, дзякуючы ўпартай барацьбе штодзенкі за паляпшэньне бытавых умоў рабочых-ліцейшчыкаў.

Штодзенка рамонтнага цэху правяла новую форму работы. На сваіх старонках яна праводзіць заочную вытворчую нараду. На сёньня ўжо выказаліся па высунутых ёю пытаньнях 5 старых рабочых.

Новым у нашай рабоце зьяўляецца арганізацыя «выязной рэдакцыі» «Чырвонага молату» па дапамозе штодзенцы брыгады камнядрабілак «АКМЭ».

Штодзенкі заводу ўключыліся ў правядзеньне сталінскай эстафэты і перавыборчай кампаніі прафарганізацыі.

Усе гэтыя дасягненьні, якіх мы дабіліся ў рабоце нізавога друку і рабкораўскага руху, сталі магчымымі толькі дзякуючы таму, што партыйная арганізацыя заводу з бальшавіцкай настойлівасьцю праводзіла ў жыцьцё пастановы партыі і рашэньні другога ўсебеларускага зьезду рабселькоравскага руху.

Партыйныя ячэйкі, за малым выключаньнем, выстарчальна кіруюць работай рэдкалегій штодзенак. Недаацэньвае яшчэ значэньня работы і кіраўніцтва друкам партыйная ячэйка інструментальна-рамонтнага цэху, у выніку чаго работа рэдкалегіі штодзенкі анахронізіцца не на лежнай вышыні.

Партколектыў павінен прыняць адпаведныя меры.

Дзякуючы кіраўніцтву партыйнага калектыву і яго органу «Чырвонага молата», штодзенка на заводзе заваявала сабе пэўнае месца, з ёю лічацца, яна стала арганізатарам мас за рэалізацыю 6 гістарычных умоў тав. Сталіна.

Наша задача—ня спыняцца на дасягнутых посьпехах, а весьці далейшую барацьбу за замацаваньне посьпехаў, якія ёсьць, дабіцца арганізацыі ў кожнай брыгадзе штодзенкі—сэкрэцыйнасьцікага змагара за пляны, за якасьць, за тэмпы.

Калектыўны рабкор газэты «Зьвязда», рэдакцыя шматтыражкі заводу імя Варашылава «Чырвоны молат».

ЭСТЭРКІН, РАКІТА.



Будаўніцтва ЦЭС імя Сталіна на Масхэмэнэргабуду

ЗЯБЛІВАЕ ВОРЫВА ПРАЦЯГВАЦЬ

МОЖНА І ТРЭБА ЎДЗЕСЯЦЯРОНЫМІ ТЭМПАМІ

Калегія НКЗБ аб уборцы бульбы і ходзе зяблева

27-га кастрычніка калегія НКЗБ разглядала апэрацыйныя даныя аб ходзе ўборкі бульбы, гародніны і зяблевым ёнах.

Адзначана нездавальняючае выкананьне плянаў зяблева па рэспубліцы ў цэлым і асабліва па Чавускім, Ельскім, Бешанковіцкім, Чашніцкім, Уваравіцкім, Буда-Кашалёўскім, Лоеўскім, Крычаўскім, Касьцюковіцкім і Бягомльскім раёнах.

Па лініі Саўгастросту і Трактарацэнтру не дасягнута сапраўды ўдарных тэмпаў у выкананьні плянаў зяблева.

Уборка бульбы таксама поўнасьцю не праведзена ў тэрміны, устаноўленыя ЦК КП(б)В і СНК БССР. Асабліва нездавальняючая справа з уборкаю бульбы і гародніны па саўгасах Белсельтрэсту, Сьвінаводтрэсту, Белсельаб'яднаньня і Рэчыцкім, Бешанковіцкім, Старадароскім і Старобінскім раёнах.

Несвячасовае і няпоўнае перакідваньне трактарнай і конскай цягі на зяблева, зусім нізкая нагрузка цягі, іграваньне зьдзельшчыны па зяблеве і ўборцы бульбы, адсутнасьць штодзённага апэрацыйнага кіраўніцтва гэтай работай і недыстарчальная масавая работа — прычыны несвячасовага выкананьня плянаў.

За абсалютна нездавальняючае выкананьне плянаў зяблева, уборкі бульбы і гародніны, няздольнасьць арганізаваць гэту важнейшую кампанію, калегія НКЗБ пастанавіла зьняць з работы загадчыкаў Уваравіцкага і Чавускага райзаў.

Загадчыкам Рэчыцкага, Лоеўскага, Чашніцкага, Касьцюковіцкага, Крычаўскага, Бягомльскага, Стара-Даросканга і Старобінскага раёнаў абвешчана суровая вымова.

Дырэктару Белсаўгастросту прапанавана зьняць з работы і абвясьціць суровую вымову з заняцьцем у працоўных сьпісах дырэктарам саўгасаў «Весялова», «Новы шлях»; па Сьвінаводтрэсце — дырэктарам саўгасаў «Абчаг-Горкі», «Васільеўск»; абвясьціць вымову з занясеньнем у працоўныя сьпісы дырэктарам саўгасаў «Камаровічы», «Аршчаўшчыны», «Пачаевічы», Вішнеўка, імя Леніна; пазбавіць дырэктароў саўгасаў «Дучыца», «Старая Беліца» аб нядбайных адносінах і несвячасовай прысылцы вестак па сельска-гаспадарчых кампаніях.

Разам з тым, за пасьпяховае правядзеньне сельска-гаспадарчых кампаній пастаноўлена прэміяваць адміністрацыйна-тэхнічны персанал і рабочых-ударнікаў саўгасаў «Натальеўск», «Ціхаавічы», «Баконь», «Цімкава» і «Лемніцы».

Саўгастрэстам прапанавана намеціць саўгасы, якія з посьпехам справіліся з правядзеньнем асеньняй сяўбы, уборачнай і зяблевам і прэміяваць дырэктароў і рабочых-ударнікаў, прысьвяціўшых гэтае прэміраваньне да 14-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Калегія НКЗБ абавязала дырэктароў саўгастрэстаў, упаўнаважанага Трактарацэнтру і старшыню Белкалгасцэнтру на працягу 3-х дзён правесьці выкананьне дырэктыў Цк і СНК аб перакідваньні саўгасамі, калгасамі і МТС трактарнай і конскай цягавай сілы на зяблева.

Прапанавана перакінуць спэцыяльныя рабочыя брыгады саўгасаў, якія скончылі асеньняя кампаніі, у саўгасы, у якіх ёсьць прарыў ва ўборцы бульбы.

Дырэктарам саўгастрэстаў, МТС, саўгасаў і загадчыкам райза і старшынём райсаюзаў прапанавана скончыць уборку бульбы, гародніны і зяблевае ворыва ў бліжэйшыя дні і тэлеграфна паведаміць НКЗБ аб сканчэньні гэтай работы.

З 13 трактараў працуюць усяго 3

УВАРАВІЧЫ.

Ня гледзячы на тое, што ў саўгасе «Уваравічы» налічваецца 13 трактараў, плян зяблева на 27 кастрычніка выкананы толькі на 10 проц. У выніку абязьлічкі і пануючай безгаспадарчасьці ў саўгасе 5 трактараў каля 2-х месяцаў стаяць у рамонце. На зяблеве працуюць толькі 3 трактары.

Дырэкцыя саўгасу груба ігнаруе дырэктыву аб максымальным скарыстаньні жывой цягавай сілы. Ня гледзячы на гапебнае адставаньне, ні адзін конь саўгасу не пераключан на зяблева.

Партыйная ячэйка і рабачком саўгасу стаяць у баку ад выкананьня дырэктыў партыі і ўраду па зяблеве. РВК павінен прыняць самыя рашучыя меры да адміністрацыі саўгасу «Уваравічы», якая зрывае плян зяблева.

ГАВІЗЕНСКІ.

1 гэктар на плуг

Норма ўдарнай брыгады аратых калгасу „3-ці рашаючы“

**БРАГІН. У РАШАЮЧЫЯ ДНІ ЗЯБЛЕВАЙ КАМПАНІІ БРЫГАДА КАЛГАСУ «ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ» АБВЯСЬЦІЛА СЯБЕ ЎДАРНАЙ І ВЫКЛІКАЛА НА СПАБОРНІЦТВА БРЫГАДУ АРАТЫХ КАЛГАСУ «НОВЫ СЬВЕТ». НА 25 КАСТРЫЧНІКА БРЫГАДА КАЛГАСУ «ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ» ВЫКАНАЛА ЎЗЯТЫЯ НА СЯБЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ І СКОНЧЫЛА ЗЯБЛІЦЬ.

Ліквідаваць запазычанасьць перад пралетарамі Ленінграду

Год выданьня—XV
№ 273 (4204)
Нядзеля, 1 лістапада
Цана нумара 5 кап.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—4-27,)—сакратар—10-74, партсэктар—13-80, прамысл.—13-80, сац. земл.—6-19, мясц. інф. арм.—6-19, замеж. інфарм.—6-19, навук. рэдактар—6-42, міжнародняй інфармацыі—10-74, контрольна-рэв.—2-81, аддел. абвестак—7-41

На 31 кастрычніка плян адгрузкі бульбы Ленінграду выканан толькі на 69,5 проц.

На аснове рашучай барацьбы з кулацкімі спажывецкімі тэндэнцыямі, шырокага разгортваньня масава-палітычнай работы, сацспаборніцтва і ўдарніцтва - дабіцца поўнага сканчэньня адгрузкі ў бліжэйшыя-ж дні

Ход адгрузкі бульбы Ленінграду

(У ТОНАХ)

25-X	27-X	28-X	29-X	30-X
2.800	2.614	2.877	2.577	3.468

Японскія імпэрыялісты

рыхтуюць захват цыцыкару

Грабежніцтвы і гвалты акупантаў у Манчжурыі

Баі вакол Цыцыкару (горад, які знаходзіцца ў паўночнай Манчжурыі, блізка да Кіт.-Усход. чыг.) Камандваньне акупацыйнай арміі пагражае бомбардыроўкай гораду

Вялікае ўгажаньне ў Кітаі зрабіла заява т. Карахана

ШАНХАЙ, 30. Адказ тав. Карахана на заяву японскага пасла ў Маскве Хірота зрабіў вялікае ўражаньне ў кітайскіх колах. Кітайцы выказваюць асаблівае здавальненьне тэй часткай заявы Карахана, дзе гаворыцца аб захаваньні СССР дагавораў, падпісаных у Кітаі і паважаньне «незалежнасьці другіх дзяржаў». У кітайскіх колах указваюць, што з часу акупацыі Манчжурыі ні адна дзяржава не гаварыла з Японіяй а такой яснасьцю і выразнасьцю, як СССР.

Новы ультыматум японскай ваеншчыны

БЭЙПІН, 30. Паводле паведамленьня з аўтарытэтных кітайскіх крыніц, 24-га кастрычніка да камандуючага цыцыкарскімі войскамі генэрала Ма зьявіліся два японцы ў ваеннай форме з заявай, што яны зьяўляюцца упаўнаважанымі камандуючага і што ЯНЫ ПАТРАБУЮЦЬ ЗДАЦЬ ЦЫЦЫКАР ЧАН ХАЙПЭНУ. У выпадку адмаўленьня японцы пагражалі, што БАЯВАЯ ЭСКАДРЫЛІЯ ЯПОНСКІХ САМАЛЁТАЎ БАМБАРДЫРУЕ ЦЫЦЫКАР І ЯПОНСКІЯ ВОЙСКІ ПАВЯДУЦЬ НАСТУПЛЕНЬНЕ НА ГОРАД. Генэрал Ма адхіліў гэта патрабаваньне. Японскае консульства ў Цыцыкары, куды кітайскія ўлады зьвярнуліся за растлумачэньнем, заявіла, што яму нічога невядома аб указаных наведвальніках.

Акупанты будуюць умацаваньні

БЭЙПІН, 30. Харбінская газэта «Біпцаэшыбао» паведамляе, што японскія войскі будуюць умацаваньні ў раёне станцыі Мукдэн, аэрадрому, арсэналу і вайсковай школы. Ва ўсіх вёсках у насельніцтва канфіскуецца зброя. Канфіскавана больш 70.000 вінтовак. Гаспадарчае жыцьцё ў Мукдэне замерла. Пад націскам японскіх улад, некаторыя прадпрыемствы адкрыліся, але не праводзяць ніякіх апэрацый. Буйныя спэкуляцыі адбываюцца на валютным і харчовым рынках. Цэны на прадукты павысіліся ў некалькі раз у той час, як пакупная здольнасьць насельніцтва рэзка зьнізілася. Усе прыватныя і казённыя школы закрыты. Функцыянуюць толькі місіянэрскія школы.

Консул абвінавачаецца ў „раскрыцьці таямніц"

ТОКІЁ, 30. Газэты «Чуо» і «Міяко» паведамляюць з Мукдэну, што ваенны суд Квантунскай арміі 28 кастрычніка выклікаў генэральнага консула Хаясі (японскі консул у Мукдэне) і дапытваў яго некалькі гадзін. Хаясі абвінавачваецца ў раскрыцьці ваенных таямніц чужаземным дыплёматам і кітайскім дзеячам зараз-жа пасьля захвату Мукдэну японскімі войскамі. Хаясі вызвалены толькі ў рэзультаце ўмяшаньня «некаторых колаў», якія даведаліся своячасова аб тым, што ваенныя ўлады маюць намер прыняць «рашучыя меры» ў адносінах да Хаясі.

Дэпартамэнт кантролю над прамысловасьцю

БЭЙПІН, 30. У Мукдэне арганізован «дэпартамант прамысловасьці». Усе апэрацыі дэпартаманту павінны быць ухвалены японскімі ўладамі. Кіраўнікі кітайскай прамысловасьці не павінны пад трымліваць ранейшай манчжурскай улады пад пагрозай строгіх пакараньняў. У ліку членаў дэпартаманту ёсьць таксама прадстаўнікі японскіх улад.

Японскі стаўленік рухтуе захват Цьзіньчоў

БЭЙПІН, 30. Паводле паведамленьня японскіх газэт у Чаньчуне выступіўшы гэтымі днямі на чале буйных ваенных сіл прыхільнік «незалежнасьці Манчжурыі» генэрал Лі Ін-чын заняў інкоў і падрыхтоўвае захват Цьзіньчжоу. Газэты ўказваюць, што Лі Ін-чын зьявзан з Чжан Цзун-чанам, які жыве ў Порт-Артуры.

„Кантон" за перагаворы з Японіяй

ТОКІЁ, 30. Агенцтва Сімбун Рэнго паведамляе з Шанхая, што Вал Цьзін-вэй, Ху-Хан-мін і іншыя кантоны катэгарычна выказваюцца за непасрэдныя перагаворы з Японіяй, матывуючы гэта тым, што «далей спадзяванца на Лігу Нацый азначае ў канчатковым выніку, што Кітаем кіруе абяднаньне сусьветных дзяржаў».

Ліквідаваць запазычанасьць!

У апублікаванай 5-га кастрычніка пастанове ЦК КП(б)Б прапанаваў усім раёнам «МАКСЫМАЛЬНА ФАРСАВАЦЬ АДГРУЗКУ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ З ТЫМ, КАБ ПА БССР АДПРАЎЛЯЦЬ НЯ МЕНШ 400 ВАГОНАЎ У ДЗЕНЬ, ПАДПАРАДКАВАЎШЫ МЯСЦОВЫЯ ЗАПАТРАБАВАНЬНІ ГЭТАЙ ЗАДАЧЫ... УСТАНАВІЦЬ ТЭРМІН АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ДЛЯ ЛЕНІНГРАДУ НЕ ПАЗНЕЙ, ЯК ДА 1-га ЛІСТАПАДА».

Сёньня — апошні тэрмін адгрузкі, а між тым яна далёка яшчэ ня скончана. На 31-га кастрычніка замест 175 тысяч тон бульбы адгружана толькі 121.625 тон, або 69,5 проц. пляну. Гэты прарыў —вынік недапушчальна нізкіх тэмпаў адгрузкі на працягу ўсяго кастрычніка. Ужо ў першыя пяцідзеўні пасьля пастановы ЦК загатоўчыя арганізацыі ня выконвалі заданьняў па адгрузцы. Замест 400 вагонаў у дзень адгружалася толькі 20-30 вагонаў.

Слабыя тэмпы адгрузкі тлумачацца ў першую чаргу апартуністычнай недацэнкай важнасьці забесьпячэньня бульбай пралетарскіх цэнтраў з боку цэлага раду раённых арганізацый. Чым інакш можна вытлумачыць той факт, што на 28-га кастрычніка СМАЛЯВІЦКІ раён выканаў сваё заданьне па адгрузцы... на 6 проц., СІРОЦІНСКІ—на 14 проц., І.УХАВІЦКІ—на 5,9 проц., ЛЕЛЬЧЫЦКІ—на 18,1 проц., СТАРОБІНСКІ—на 24,8 проц., УВАРАВІЦКІ—на 20,6 проц. І г. д.

Рэальнасьць пляну, поўная магчымасьць іх выкананьня зусім выразна даведзены перадавымі раёнамі, якія, пабальшавіцку ўключыліся ў кампанію з самага пачатку, разгарнуўшы шырокую масава-палітычную работу вакол загатовак і адгрузкі бульбы, мабілізаваўшы масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў на рашучы адпор кулацтву і яго права-«лявацкай» агентуры, дабіліся перамогі на фронце адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам. ПОЛАЦКІ раён, напрыклад, выканаў 181 проц. свайго заданьня, БАБРУЙСКІ — 143,5 проц., БЯРЭЗІНСКІ—128,2 проц., БЯГОМЛЬСКІ—103 проц., ДУБРОВЕНСКІ—102 проц., СЕНЬНЕНСКІ — 102,8 проц., КАСЬЦЮКОВІЦКІ—99,4 проц. Рад раёнаў наспіяецца да выкананьня пляну адгрузкі. Так, ГЛУСКІ раён ужо адгрузіў 91,4 проц. свайго заданьня, КАПЫЛЬСКІ — 94,6 проц., АСІПАВІЦКІ—88,7 проц. І г. д.

Весткі з месц паказваюць, што ў некаторых калгасах і сельсаветах існуюць спажывецкія, кулацкія тэндэнцыі—забясьпечыць бульбай спачатку сябе, а потым ужо думаць аб адгрузцы яе пралетарскім цэнтрам. Мстар'ялы з Капыльскага раёну, якія мы сёньня друкуем, сьведчаць аб тым, што на мясцох яшчэ невыстарчальна разгорнута барацьба з гэтымі шкодным кулацкімі тэндэнцыямі. Старшыня калгасу «АРАТЫ» (Капыльшчына) АСТРЭЙКА замест таго, каб узяцца за баявое выкананьне пляну дачы бульбы дзяржаве, займаецца разважаньнямі аб «нерэальнасьці» заданьня, аб немагчымасьці яго выкананьня.

Баявая задача ўсіх раённых арганізацый—у бліжэйшыя-ж дні патроіць тэмпы адгрузкі бульбы Ленінграду з тым, каб да 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі поўнасьцю скончыць адгрузку. АДНАЧАСОВА ТРЭБА ЗАРАЗ-ЖА РАЗГАРНУЦЬ АДГРУЗКУ БУЛЬБЫ МАСКВЕ З ТЫМ, КАБ ДА 7-га ЛІСТАПАДА АДГРУЗІЦЬ НЯ МЕНШ 20.000 ТОН.

Перадавыя раёны павінны ўзяць на ўнсір адстаючыя і дапамагчы ім у выкананьні заданьняў. Трэба з усёй бальшавіцкай бязьлітаснасьцю ўдарыць па спажывецкіх тэндэнцыях у пасобных калгасах, даць рашучы адпор кулацкай агітацыі, поўнасьцю і неадкладна спагнаць цьвёрдыя заданьні з усіх кулацка-заможных гаспадарак.

Раўняцца па калгасах „Чырвоны прамень" і „Шосты зьезд саветаў"

ВУШАЧЫ.

Вушацкі раён паводле пляну павінен адгрузіць Ленінграду 3.973 тоны бульбы. На 28-га кастрычніка адгружана толькі 38,9 проц. пляну. Раённыя арганізацыі ня ўключыліся па-баявому ў гэту важнейшую кампанію.

Прыклад лепшых калгасаў і сельсаветаў, якія з посьпехам выканалі плян адгрузкі, не падхоплен усімі калгасамі і сельсаветамі раёну.

Калгас «ЧЫРВОНЫ ПРАМЕНЬ» датэрмінова скончыў уборку бульбы і арганізаваў дапамогу суседняму калгасу «ЦЭЛТНЭ». Ён-жа з посьпехам ПЕРАВЫКАНАЎ плян адгрузкі бульбы. Замест 600 пудоў адгружана 660.

Па-ўдарнаму выконвае свае плянавыя заданьні і калгас «ШОСТЫ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ» і іншыя.

У той-жа час рад сельсаветаў яўна зрываюць адгрузку. КУБЛІЦКІ сельсавет выканаў заданьне на 9,6 проц., САРАЧЫНСКІ—на 11,6 проц., ЖАРСКІ—на 15 проц.

Ударные тэмпы работы калгасаў «ЧЫРВОНЫ ПРАМЕНЬ» і «ШОСТЫ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ» павінны быць падхоплены ўсімі калгасамі і сельсаветамі раёну.

Э.

Калгас „Араты" ашуквае дзяржаву

КАПЫЛЬ. (НАШ СПЭЦ. КАР.).

КАЛГАС «АРАТЫ» ПАВІНЕН ЗДАЦЬ ДЗЯРЖАВЕ 40 ТОН БУЛЬБЫ, АДНАК, ДАГЭТУЛЬ НЯ ЗДАНА ЯШЧЭ НІ АДНАГО ЦЭНТЭРА.

СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ АСТРЭЙКА ДЗЕЙНІЧАЕ ЯК САПРАЎДНЫ ДВУРУШНІК. СЁНЬНЯ ЁН ПРЫМАЕ ПЛЯН, А НАСТАЎТРА КРЫЧЫЦЬ АБ НЕМАГЧЫМАСЬЦІ ЯГО ВЫКАНАНЬНЯ. АСТРЭЙКА ЎЖО ЗАГАДЗЯ «ВЫЛІЧЫЎ», ШТО ДЛЯ КОРМУ НАЯЎНЫХ СЬВІНЕЙ (КАЛГАС МАЕ СЬВІНАГАДОЎЧУЮ ФЭРМУ) ПАТРЭБНА НА КОЖНЫ ДЗЕНЬ 70 ПУД. БУЛЬБЫ. НА СПРАВЕ-Ж ПА РАЦЫЁНЕ ПАТРЭБ НА ЗНАЧНА МЕНШ. СВАІМІ РАЗВАЖАНЬНЯМІ АБ «НЕРЭАЛЬНАСЬЦІ ПЛЯНУ» АСТРЭЙКА РАСПАЛЬВАЕ СПАЖЫВЕЦКІЯ ТЭНДЭНЦЫІ СЯРОД АДСТАЛЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ.

КАЛГАС ТАКСАМА НЯ ВЫКАНАЎ ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК. ЗАМЕСТ 190 ЦЭНТ. ЗДАНА ТОЛЬКІ 162.

67 ЦЭНТ., ЯКІЯ БЫЛІ ЗДАНЫ КАЛГАСАМ У ЛІК ЗВАРОТУ НАСЕННАЙ НАЗЫЧКІ, І НЯ МАЮЦЬ НІЯКІХ АДНОСІН ДА ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК, УЛІЧАНЫ КАЛГАСАМ У ПЛЯНАВЕ ЗАДАНЬНЕ. ГЭТА НЕЛЬГА КВАЛІФІКАВАЦЬ ІНАКШ, ЯК АШУКЕНСТВАМ ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ, НЕЖАДАНЬНЕМ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК.

ТРЭБА РАШУЧА ЎДАРЫЦЬ ПА АПАРТУНІСТАХ—ЗРЫЎНІЧЫКАМ ЗАГАТОВАК. КАЛГАС «АРАТЫ» МОЖА І ПАВІНЕН СВАЯЧАСОВА І ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ СВАЕ ЗАГАТОЎЧЫЯ ПЛЯНЫ.

Б. Х.

ДА ЯПОНА-КІТАЙСКАГА КАНФЛІКТУ

Палітыка СССР—палітыка міру і пашаны да незалежнасьці другіх дзяржаў

Паведамленьне ТАСС

28 кастрычніка г. г. японскі пасол п. Хірота паведаў намесьніка народнага камісара па замежных справах СССР тав. Л. М. Карахана і па даручэньні японскага ўраду зрабіў наступную заяву:

Заява п. Хірота

—З часу ўзьнікненьня японска-кітайскага інцыдэнту паміж намі ня было ніякіх падзей, якія адбіліся-б на нашых адносінах, што можна лічыць вялікім шчасьцем. Толькі за апошні час у Манчжурыі ідуць розныя чуткі, якія датычаць узаемаадносін розных генэралаў або генэральскіх груп. Японскі ўрад, лічачы гэта карысным для нашых адносін, загадаў пасолу паведаміць інфармацыю, якую ён з гэтага поваду мае.

ГЕНЭРАЛ МА (Цыцыкарскі) перад выездам з Сахалёну каля 12-13 кастрычніка рабіў з афіцэрам Чырвонай арміі, які прыехаў з Благавешчанску.

У арміі генэрала Ма ёсьць савецкія інструктары.

Генэрал Ма гаварыў, што ёсьць згода, паводле якой ён атрымлівае з Савецкага Саюзу ваенныя самалёты, зэнітныя гарматы і пётнікаў.

На заходняй лініі Кітайска-Ўсходняй чыгункі, каля Цыцыкару, сканцэнтроўваюцца таварныя вагоны, з якіх 300 вагонаў у раёне станцыі Манчжурыя.

Кітайскія войскі Хэйпуцьзянскай правінцыі, якія знаходзяцца на паўночным беразе ракі Нонха, атрымліваюць гарматы з Савецкага Саюзу.

З цягнікам, які ішоў ад Цыцыкару да канцовага пункту Таопан-Цыцыкарскай чыгункі, адпраўлена 12 зэнітных гармат, 4 палявыя гарматы і інш. зброя, снарады і ваенныя матар'ялы, якія кэйпуцьзянскія войскі атрымліваюць з СССР.

Паводле заявы генэрала Ма ў Савецкім Саюзе каля станцыі Даўрыя канцэнтруюцца савецкія войскі ў колькасьці 20—30 тысяч чалавек; апрача таго там ёсьць 600—700 таварных вагонаў. Ёсьць намер паслаць гэтыя войскі ў Манчжурыю.

З поваду гэтага генэрал Ма даў зразумець, што для аховы КУЧ даволі кітайскіх войск і таму ён просіць гэтыя войскі з Даўрыі перавесьці ў глыбіню краіны.

Апрача гэтых чутак і вестак ёсьць другая інфармацыя аб савецка-кітайскіх адносінах, а іменна аб цесным супрацоўніцтве паміж СССР і Кітаем у сувязі з падзеямі ў Манчжурыі.

Аб гэтым гавораць у Шанхаі, Харбіне і іншых месцах.

Такім чынам ёсьць шмат чутак і вестак, якія хвалююць грамадзкую думку Японіі і ваенныя ўлады, якія знаходзяцца ў Манчжурыі.

Калі будуць паслаены войскі СССР на Кітайска-Ўсх. чыг., гэта будзе пагоршваць атмасфэру і абвастраць становішча, і японскі ўрад вымушан быў-бы для абароны сваіх рэсэйдэнтаў і для абароны чыгункі Тэонань-Какокэ (Таонань-Цыцыкарская дарога), якая па будавана на японскія грошы, прыняць неабходныя меры абароны.

Такім чынам існуе вялікая небясьпека, што сфэра канфлікту пашыраецца.

***

29-га кастрычніка тав. Карахан запрасіў японскага пасла т. Хірота і зрабіў яму па даручэньні ўраду СССР наступную заяву.

Заява тав. Карахана

— Урад СССР ня можа ня выказаць свайго зьдзіўленьня з поваду зробленай 28 кастрычніка г. г. японскім паслом п. Хірота ад імя японскага ўраду заявы, які спасылаецца на пазбаўленыя ўсялякай падставы выдумкі і чуткі, зыходзячыя ад безадказных асоб з японскіх або кітайскіх колаў, чамусьці зацікаўленых пры цяперашнім становішчы Манчжурыі ў пашырэньні правакацыйных чутак.

Японскі ўрад ня можа ня ведаць, што ніякіх савецкіх інструктароў няма ў цыцыкарскіх войсках, таксама як іх няма ў войсках любой іншай правінцыі Манчжурыі, што ніякай зброі або ваеннага рыштунку з СССР гэтыя войскі не атрымлівалі і не атрымліваюць і што ніякае падтрыманьне не аказваецца СССР ні аднаму з бакоў, якія змагаюцца ў Манчжурыі.

Урад Саюзу трымаецца палітыкі строгага няўмешваньня не таму, што такая палітыка можа быць угодна або няўгодна каму-б там ні было. Саюзны ўрад трымаецца палітыкі няўмешваньня ён паважае міжнародныя дагаворы, заключаныя з Кітаем, паважае суверэнныя правы і незалежнасьць другіх дзяржаў і лічыць, што палітыка ваеннай акупацыі, якая праводзіцца хаця-б пад выглядам так званай дапамогі несумяшчальна з мірнай палітыкай СССР і з інтарэсамі ўсеагульнага міру.

Урад СССР выказвае надзею, што гэты адказ вычэрпае ўсе тыя пытаньні, якія былі ўзбуджаны заявай, зробленай японскім паслом п. Хірота 28 кастрычніка г. г.

Польска-латвійскі канфлікт абвастраецца

Польскі друк пагражае

ВАРШАВА, 30. За апошнія дні ў цэнтры ўвагі польскага друку стаіць пытаньне аб польска-латвійскім канфлікце. 27 гэтага месяца латвійскі паверны ў справах па даручэньні свайго ўраду ўнёс новы пратэст супроць студэнцкіх дэманстрацый, «чакаючы, што польскі ўрад асудзіць дзейнасьць безадказных фактараў». Пратэст быў катэгарычна адхілен. Афіцыёзная «Газэта Польска» рашуча патрабуе ўстанавіць, хто адказны за раптоўнае пагоршаньне гэтых адносін. «Кур'ер поранны» піша: «Нават Літва да таго абнаглела, што цалком адкрыта і цынічна... выступае ў якасьці мізэрнай зброі германскай або савецкай палітыкі... «Адмаўленьне Латвіі закуплець польскі каменны вугаль газэта расцэньвае, як пачатак польска-латвійскай мытнай вайны. «Уяўнікае яшчэ адна вайна без вайны,—працягвае «Кур'ер поранны», — у нас іх ужо тры: з Літвой, Германіяй і Латвіяй—заўтра магчыма з саветамі. Стваравецца кольца, якое павінна акружыць, замкнуць, ізаляваць нас».

БССР сустракае 14-ю гадавіну Кастрычніка новымі

ВЫТВОРЧЫМІ ПЕРАМОГАМІ

Выклік рабочых заводу імя Сталіна

Дэпутацкая група машынабудаўнічага заводу імя Сталіна ў БАБРУЙСКУ ўзяла на сябе рад абавязацельстваў, якія павінны быць праведзены ў жыцьцё да сьвяткаваньня 14-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Квартальны прамфінплян павінен быць выканан да сьвята на 54 проц. Рабочыя абавязуюцца канчаткова ліквідаваць абязьлічку, дабіцца зьніжэньня процанту браку да 5; да 7 лістапада перавесьці на гаспадарчы разрахунак 6 брыгад; арганізаваць новыя ўдарныя брыгады імя Кастрычніцкай рэвалюцыі; унесьці 50 вытворчых рацыяналізатарскіх прапаноў у фонд 14-ай гадавіны; перадаць лепшых ударнікаў у рады партыі і камсамолу. Дэпутацкая група заводу ўзяла на сябе шэфства над правядзеньнем політэхнізацыі ў падшэфнай школе.

Рабочыя абавязуюцца дапамагчы падшэфнаму Харлапавіцкаму сельсавету ў арганізацыйна-гаспадарчым узмацненьні калгасаў.

Рабочыя заводу імя Сталіна выклікалі ўсе прадпрыемствы Бабруйску на сацспаборніцтва па лепшым правядзеньні справаздачнай кампаніі савету і сьвята 14-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Дапаможам пуску новых прадпрыемстваў

Дзень 14-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі рабочыя Гомельшчыны адзначаюць пускам у ход раду новых прадпрыемстваў: элеватару, маргарынавага заводу, дрэваапрацоўчага камбінату і г. д.

Гомельская мантажна-тэхнічная кантора УЭА зьвярнулася да рабочых, ІТР і служачых менскага аддзяленьня з адкрытым лістом, у якім адзначае, што пуск заводаў да Кастрычніцкіх сьвят залежыць часткова ад хутчэйшага сканчэньня мантажных работ.

Рабочыя Гомельскай канторы абавязаліся прыкласьці ўсю энэргію да таго, каб да Кастрычніцкіх сьвят скончыць работу. Для таго, каб калектыў ажыцьцініў свае абавязкі перад рабочымі новых пабудоў, менская кантора павінна ўважліва адносіцца да выкананьня тэрміновых заказаў на разьмеркавальныя, групавыя, сілавыя і асьвяціцельныя шчыты для элеватара, Гомсельмаша, маргарынавага заводу і дрэваапрацоўчага камбінату. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на якасьць выкананьня заказаў, каб ня было ніякіх перабояў у рабоце.

Ліст падпісан прадстаўнікамі партканкалектыву, камсамольскага калектыву, заўкому і адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу.

Работнікі каапэрацыі рыхтуюцца да сьвята

Саюз работнікаў каапэрацыі і гандлю да гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі склікае два зьлёты ўдарнікаў. Наладжваюцца вытворчыя канфэрэнцыі з прадстаўнікоў рабочых ад вытворчасьці, пайшчыкаў і прадаўцоў.

Арганізуюцца самаправерачныя брыгады імя 14-й гадавіны Кастрычніка. Намячаецца пасяджэньне гаркамітэту разам з сацсумяшчальнікамі.

Адкрываецца ўзорны камсамольскі каапэратыў. Усё сьвята праводзіцца пад лёзунгам перабудовы работы каапэрацыі.

Да Кастрычніцкіх сьвят ліквідаваць прарывы

ВОРША. (БЕЛТА). АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ АБВЯСЬЦІЎ СЯБЕ МАБІЛІЗАВАНЫМ НА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВАЎ У ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ, ВЫКАНАНЬНІ ФІНПЛЯНУ І АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫМ УМАЦАВАНЬНІ КАЛГАСАЎ.

СХОД УЗЯЎ НА СЯБЕ АБАВЯЗАК ДА 14-АЙ ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ ВЫКАНАЦЬ 75 ПРОЦ. ГАДАВОГА ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК І 50 ПРОЦ. КВАРТАЛЬНАГА ЗАДАНЬНЯ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ.

ДЛЯ ДАПАМОГІ СЕЛЬСАВЕТАМ У ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ НАКІРАВАНА 35 АДКАЗНЫХ РАБОТНІКАЎ.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Ад народнага камісарыяту працы БССР

28 кастрычніка 1931 г. № 45 г. Менск

У сувязі з тым, што агульнымі сходамі некаторых прадпрыемстваў і ўстаноў выносяцца пастановы аб адпрацоўцы ў сьвята 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі для ліквідацыі прарываў на асобных вучастках выкананьня прамфінплянаў і г. д., Наркампрацы БССР, па згодзе з ЦСПСБ, растлумачае, што работа ў дні 7 і 8 лістапада КАТЭГАРЫЧНА ЗАБАРАНЯЕЦЦА (нават у тых выпадках, калі на гэта ёсьць пастановы агульных сходаў).

Работа ў гэтыя дні можа дапускацца выключна на прадпрыемствах і ўстановах, якія бесьперапынна дзейнічаюць і якія па характары вытворчасьці павінны бесьперапынна абслугоўваць насельніцтва (электрастанцыі, тэлеграф, прадпрыемсты грамадзкага харчаваньня, трамваі, культурныя ўстановы і інш.) з дазволу у кожным пасобным выпадку мясцовых органаў працы.

УВАГА: Калі з прычыны безадкладнасьці работ ці неабходнасьці выкананьня тэрміновых урадавых заданьняў патрабуецца работа ў іншых галінах народнай гаспадаркі, дык гэта можа мець месца выключна з дазволу Наркампрацы, для чаго адпаведным рэспубліканскім аб'яднаньням ці Установам неабходна ўзьняць пытаньне перад НКПБ не пазьней, як за пяць дзён да сьвята.

Наркампрацы БССР БАСКІН.
Узгоднена з ЦСПСБ: ПЛЕШАКОЎ.

„Чыр. Зорка" Пач. 7; 8-45; 10-30 — БОЙКІ ЖЫЦЬЦЯ. Звыш праграмы ГУКАВЫ фільм

ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня — ДЗЯЎЧЫНА З ПАЛУБЫ. Звыш праграмы ВІЦМЯСКАЯ ТАЙГА.

„Юкы Піянэр" (бурыян кіно „Культура") — Арыгінальная камэдыя ДЖОЙ І ДРУЖОК Пач. у 1 г. Каса—з 11 г.

„СПАРТАК" Касаадкрыта з 5 г. — Выдатны фільм ГАМБУРГ у 6 частках

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ аб згубе ДАКУМАНТУ 1 рубель

АБВЕСТКІ — 1 — ПАВЕДАМЛЕНЬНІ ў чарговы нумар „ЗЬВЯЗДЫ" прымаюцца толькі да 2-х гадз. дня

КІНО „Інтэрнацыянал" Адкрыта штодзенна з 12 гадз. дня.
Ад нядзелі, 1 лістапада
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
ПАВОДЛЕ АПОВЕСЦІ І. Франко.
БАРЫСЛАУ СЬМЯЕЦЦА
У галоўных ролях вядомыя кіно-артысты ЗАМЫЧКОЎСКІ, М. ЛЯРОЎ.

КІНО „КУЛЬТУРА" 31 лістапада
НОВЫ ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ
Падарожжа Свэн-Гедына па пустынях Цэнтральнай Азіі
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ:
УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ СЭСІІ АКАДЭМІІ НАВУК.
Каса адкрытая 5 гадз.
Пачатак сэансаў у 7, 8-45 і 10-10

Менгарком КП(б)Б, Гар.КК і рэдакцыя газ. „Рабселькор" 1 лістапада склікаюць
АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ ЗЬЛЁТ РАБКОРАЎ,
членаў рэдкалегій насьценных, штодзённых і шматтыражных газэт прадпрыемстваў, совгаспаў, каапэрацыйных і навучальных устаноў г. Менску
з парадкам дня:
1) Аб сумеснай рабоце органаў КК-РСІ і рабкораў (дакл. т. Кеніг).
2) Аб разгортваньні работы штодзёнак.
Пасьля зьлёту—мастацкая частка.
Зьлёт адбудзецца ў памяшканьні вялікай залі Дому Камасьпеты ў 6 гадз. веч.
Білеты атрымаць у Культпропе Гаркому, пакой 19.
На зьлёт запрашаюцца прадстаўнікі ЦКК-РСІ і рэдакцый цэнтральных газэт.
Менгарком КП(б)Б:
Менгарпк РСІ
Рэдакцыя газ. „Рабселькор"

Францыя праўленьня ЖАКТ'у № 7 склікае
агульны сход партыйцаў і камсамольцаў
якія пражываюць у домах ЖАКТ'у № 7, 9 і 11 (б. № 7)
2-XI-31 г., у 7 гадз. веч., у канцылярыі ЖАКТ'у (Н.-Маскоўская 1-13).
У сувязі з важнасьцю пытаньняў яўка абавязковая.

СЕНЬНЯ, 1-га лістапада у 7 гадзін вечара, у памяшканьні ВСНГ (заля для сходаў), у сувязі з пачаткам заняткаў, адбудзецца
АРГАНІЗАЦЫЙНЫ СХОД
усіх таварышоў, якія залічаны на
завочныя курсы чырвоных дырэктароў
(курсы па аўладаньні тэхнікай) і працуюць на прадпрыемствах і ва установах Менску.
ЯЎКА АБАВЯЗКОВА.

МЕНСКАЯ ТЭЛЕФОННАЯ СТАНЦЫЯ
даводзіць да ведама ўсіх устаноў, прадпрыемстваў, арганізацый і грамадзян, што з 15 лістапада г. г. будзе прыступлена
да ўстаноўкі па гораду тэлефонаў для Аўтаматычнай Тэлефоннай Станцыі.
Існуючыя апараты будуць зьняты са дня пуску АТС.
Усе жадаючыя мець у сабе тэлефоны, як сучасныя абаненты, так і па новых установах, запрашаюцца падаць заявы на АТС—в. л. К.-Маркса № 10-а, 1-шы паверх,—да 15 лістапада.
Спазьніўшыяся з падачай заяў, ня будуць уключаны ў сьпіс абанентаў.
У заяве належыць вызначыць назву ўстановы, прадпрыемства, аддзелу і г. д. поўнасьцю і скорочана, дакладны адрас і № тэлефона (калі апошні ёсьць).
Дадатковых тэлефонаў ня будзе, чаму зацікаўленыя абаненты павінны таксама падаць заявы на самастойныя ўстаноўкі.
Адміністрацыя.

У пачатку лістапада ў гар. Менску
АДЫРЫВАЕЦЦА
БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ ЎСЕСАЮЗНАГА АБ'ЯДНАНЬНЯ
„ТОРГСИН"
МАГАЗЫН)—(ПАСЫЛАЧНАЯ БАЗА
Грамадзяне БССР, якія атрымліваюць грошы з-за мяжы, могуць у магазыне „ТОРГСИН" у Менску набыць розныя харчавыя і прамысловыя тавары па сваім выбары і па ўмеранных цэнах. Іншагароднім грамадзянам тавар высылаецца паштовай пасылкай па выбары па спэцыяльна разасланых прэйскурантах.
Грашовыя пераводы з-за мяжы для грамадзян БССР павінны накіроўвацца на рахунак „ТОРГСИН'а" ў Беларускае аддзяленьне Дзяржбанку—Менск з дакладным указаньнем прозьвішча, імя і імя па бацьку і адрасу пераводзе атрымальніка.
Магазыны „ТОРГСИН'а" маюць поўны асартымэнт спажывецкіх тавараў, тэкстыльнае адзеньня, абутку, прадметаў хатняга ўжытку, мастацкіх і сувэнірных вырабаў, дываноў і інш.
„ТОРГСИН" мае аддзяленьні ў розных гарадох СССР.

РЫХТУЙЦЕСЯ! РЫХТУЙЦЕСЯ!
3-га лістапада, а 7-й гадзіне вечара, сакратар Цэнтральнага Камітэту УсеЛКСМ
АДКРЫЕ УСЕСАЮЗНЫ МІТЫНГ КАМСАМОЛУ ПА РАДЫЁ
ПРЫСЬВЯЧАНЫ
XIV ГАДАВІНЕ КАСТРЫЧНІКА
Ля мікрафона выступяць прадстаўнікі ВК КІМ'у, прадстаўнікі камсамолі Масквы, Харкава, Тыфлісу, Менску, Ніжняга-Ноўгараду і інш.
Кожная камсамольская ячэйка павінна ўдзельнічаць у мітынгу
ЯЧЭЙКІ неадкладна абсталюйце радыё-вузлы, гучнаяшчальнікі!
Мітынг павінна слухаць уся камсамолія і ўся працоўная моладзь Савецкай Беларусі.
Неадкладна за работу, за баявую падрыхтоўку да мітынгу!
„Чырвоная Зьмена".

2 лістапада г. г., роўна ў 7 гадз. веч., у памяш. ЦСПСБ (2-гі паверх пакой № 8) адбудзецца
чарговае пасяджэньне прэзыдыуму БелМБІТ.
З прычыны важнасьці пастаўленых пытаньняў павінны зьявіцца: члены прэзыдыуму і пленуму, члены рэспубліканскіх і мясцовых бюро.
БелМБІТ.

Менск, друкарня «Зьвязды»

Галоўлітбел № 337.